№№69–70 (2589–2590)

3 мая 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

В плену

Мои дорогие читатели!

Простите за то, что предыдущие номера газеты Вы получили с опозданием на несколько дней (в регионах, по-видимому, на целую неделю).

Не наша в этом вина.

25 апреля "Народная воля" была в очередной раз арестована. Более двух суток находилась в милицейском плену.

Чтобы вернуть газету на свободу, мне, учредителю, издателю и главному редактору, пришлось спалить немало нервов, накрутить не одну сотню километров.

Но я не имею претензий к сотрудникам Смолевичского райотдела внутренних дел, которые заперли тиражи двух сдвоенных номеров в бокс с пуленепробиваемыми стенами.

Я не имею претензий к сотрудникам Минской областной автоинспекции, перехватившим машину с газетами в районе Кургана Славы, что в каких-то тридцати километрах от столицы.

Я не имею претензий и к "бойцам невидимого фронта", под пристальным оком которых проходила операция по перехвату "Народной воли".

Все они, как и "Народная воля", — жертвы.

Жертвы репрессивной **СИСТЕМЫ**, которая, похоже, набрав бешеные обороты, сама уже никогда не остановится.

Мог ли капитан ГАИ не тормознуть автомобиль, доставляющий тиражи свежих номеров "Народной воли" из Смоленска в Минск? Мог, но уже завтра он был бы без работы.

Мог ли начальник райотдела милиции не арестовывать машину с десятками тысяч экземпляров независимой газеты? Мог, но ему пришлось бы разделить участь коллеги.

Могли "ребята в кожанках" из филиала известной спецслужбы отказаться от негласного руководства операцией? Могли, но в таком случае — прощай, карьера!

Я, друзья, прекрасно понимаю, в каком государстве мы живем. Понимаю и то, что всем нам нужно кормить детей, иметь крышу над головой, думать о завтрашнем дне. В условиях **СИСТЕМЫ,** которая сложилась в нашей стране, решать эти вопросы архисложно. Но в любом случае нужно оставаться людьми!

У каждого человека есть выбор. А потому я не понимаю людей, которые, выполняя заказ **СИСТЕМЫ**, порой готовы потерять последнюю каплю совести.

Ну подкараулили машину с "Народной волей" на трассе, загнали в милицию, разгрузили. Но зачем, скажите, людям в погонах с немаленькими звездами идти на... **подлог**?! Никогда не поверю, что пять человек, имеющих как минимум среднее образование, не могли правильно сосчитать сотню-другую пачек с газетами. Когда я узнал о том, что составлен акт, в котором засвидетельствовано, что отпечатанный в Смоленске и доставляемый в редакцию тираж "Народной воли" не соответствует сопроводительным документам — якобы более шестисот экземпляров лишних, — волосы дыбом встали.

Не поверил, несмотря на то, что в подсчете принимали непосредственное участие начальник ОБЭП и один из заместителей начальника райотдела милиции. Те, кто когда-то, присягая, клялся честно нести службу. Те, от кого в первую очередь требуется соблюдать законность.

Узнав о результатах подсчета всего тиража и отражении их в соответствующем акте, я тут же в категорической форме потребовал провести пересчет в моем присутствии. Поскольку было позднее время, милицейское начальство предложило сделать это утром следующего дня. Как долго тянулась для меня ночь, можно догадываться: по акту, составленному накануне, автоперевозчику грозил огромнейший штраф, а весь тираж газеты подлежал конфискации.

Но на следующий день я своего добился. Распломбировали бокс, и в моем присутствии был сделан повторный пересчет тиражей газеты. Замечу, в повторном пересчете участвовали тот же начальник ОБЭП и тот же заместитель начальника райотдела милиции. Только понятые были другие. И — о, чудо! — оказалось: нет ни одной лишней пачки, ни одного лишнего экземпляра! Арестованные тиражи номеров газеты ни на один экземпляр не превышают тех, которые указаны в товарно-транспортной накладной. Нет контрабанды! А значит, нет состава преступления.

Я — ликовал, тут же сообщил по телефону о срыве провокации против "Народной воли" одному очень высокому чиновнику Администрации президента. Милицейским начальникам ничего не оставалось, как поставить свои подписи под новым актом — о повторном пересчете тиражей газеты "Народная воля".

Повторяю: я никогда не поверю, что при первом подсчете кто-то просто-напросто ошибся. Имею право выстроить такую версию (в ее достоверности убеждают многие факты): смолевичскими милиционерами в акт были вписаны цифры, которые нужны были тем, кто *"стоял за их спинами и дышал в затылок"*. А понятые? А они, оказывается, были с улицы и их знают только те, кто *"стоял за спинами милиционеров"*.

Мой коллега, прибывший вслед за мной в Смолевичи сразу после получения информации о задержании машины и выгрузке тиража, видел, как они пулей вылетали со двора райотдела милиции. Вылетали, чтобы быстрее доложить вышестоящему начальству — приказ о задержании "Народной воли" выполнен! А оно — еще более вышестоящему. В провокации против независимой газеты **СИСТЕМА** задействовала всех — от начальника с генеральскими погонами до автоинспектора. Все оказались в ее плену!

Когда я более двух суток вел отчаянную борьбу за освобождение из плена "Народной воли", не один раз ловил себя на мысли: а понимают ли участники грязной и позорной операции опасность положения, в которой они сами оказались, пусть даже не по собственной воле, а по воле **СИСТЕМЫ**? С одной стороны, казалось, понимают, а с другой — не понимают. Что, заместитель начальника райотдела милиции в звании подполковника и начальник главного подразделения по борьбе с экономическими преступлениями в звании майора не знают, что внесение ложных сведений в акт влечет за собой наказание по статье 427 Уголовного кодекса ("Должностной подлог")? Знают. Как и то, что за такое преступление светит тюрьма сроком не на один год. Но страх перед **СИСТЕМОЙ**, которая, в случае невыполнения *ЗАКАЗА*, может растоптать их в один день, заставил сочинить "липовый" акт.

Конечно, не ожидали они, как и их закулисные кукловоды, что провокация против "Народной воли" будет сорвана, преступление тут же раскроется. Как же: под актом столько подписей, кто осмелится возразить, потребовать повторного пересчета? Была поставлена задача любой ценой задержать "Народную волю" по пути в Минск, не допустить ее распространения в день "Чарнобыльскага Шляху" — и она была выполнена. Ценой не только должностного подлога! После повторного пересчета тиража газеты, когда фактически вылезли наружу манипуляции с цифрами, совершенные накануне, на мое законное требование немедленно освободить из плена газету уже первый заместитель начальника райотдела милиции, не моргнув глазом, заявил: *"Я ознакомился со всеми материалами проверки и принял решение: тираж газеты вам не отдавать, есть вопросы по товарно-транспортной накладной..."*

Бесполезно было убеждать высокого милицейского начальника, что с документами полный порядок, что вчера и позавчера его люди по этому вопросу вообще не предъявляли претензий. Да и какие могут быть претензии, если по таким товарно-транспортным накладным перевозчик, с которым редакция имеет договор, доставляет газеты из Смоленска в Минск уже почти два года.

Сейчас, когда "Народная воля" уже на воле, можно часами читать мораль всем участникам той гнусной операции, которая длилась более двух суток и причинила огромный материальный и моральный ущерб как ИЧУП "Народная воля", так и многим тысячам читателей. Но я этого делать не буду. Не хочу! Противно! Скажу только: могут ли у людей, нечестно несущих службу, занимающихся в угоду **СИСТЕМЕ** фальсификацией, подтасовкой фактов, вырасти честные дети? Я сомневаюсь. И это больше всего меня волнует: в плену порочной **СИСТЕМЫ** могут оказаться и последующие поколения.

Знают ли **создатели** этой **СИСТЕМЫ**, какого монстра они создали? Думаю, знают. Как и то, что они сами стали ее заложниками.

Сегодня — заложниками, а завтра, возможно, — жертвами!

Чтобы этого не случилось, нужен срочный демонтаж зловещей **СИСТЕМЫ,** которая сама никогда не остановится. И тут необходима активная позиция: всех вместе и каждого в отдельности.

Иосиф СЕРЕДИЧ,
учредитель, издатель и главный редактор газеты "Народная воля", лауреат Международных журналистских премий, кавалер ордена Дружбы народов, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 12-го созыва.

P.S.

Эту статью я написал на русском языке, поскольку очень хочу, чтобы ее прочитали и те, кто, к сожалению, не владеет белорусским.

В заявлении, составленном по горячим следам в прокуратуру, я написал: есть *"основание предполагать, что в действиях должностных лиц... и понятых, поставивших свои подписи под актом 25.04.2007 г., содержатся признаки преступления, предусмотренные статьей 427 Уголовного кодекса* **("Должностной подлог")**. *В этой связи прошу возбудить уголовное дело по фактам преступных действий, имевших место в отношении ИЧУП "Народная воля".*

Признаюсь: заявление в прокуратуру я не довез. На втором перекрестке от редакции развернулся и через пять минут положил документ в сейф. Подумал: в ситуации, в которой оказались участники операции по наглому аресту тиражей двух сдвоенных номеров "Народной воли", находится фактически вся страна. **СИСТЕМА** загоняет народ в тупик, превращает в слепых исполнителей преступных приказов. По этой причине тысячи, миллионы людей можно бросать в тюрьмы. Я против того, чтобы Беларусь была превращена в один концентрационный лагерь.

Давайте лучше как можно скорее сделаем все возможное для того, чтобы искоренить, каленым железом выжечь все то, что толкает людей на преступления, что мешает им жить в своей стране свободно и по законам.

ЗАКУЛІСЦЕ

Сініцын і Парфяновіч у ролі правакатараў?

На шэрагу сайтаў Беларусі і Расіі з'явіўся так званы "Минский манифест белорусско-российского единения". Пад ім стаяць подпісы экс-кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Леаніда Сініцына і трохразовага алімпійскага чэмпіёна, экс-дэпутата Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Парфяновіча.

Падобна на тое, што вышэйназваны "твор" справакуе вялікі скандал не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. У той час калі Аляксандр Лукашэнка на кожным скрыжаванні сцвярджае пра непарушнасць суверэнітэту краіны, *"салодкая парачка"* прапануе *"государственное слияние"*. **"Два народа — одно государство"** — вось лейтматыў так званага "Минского манифеста..." Л.Сініцына і У.Парфяновіча. Іх прапановы — як мага хутчэй зрабіць расійскі рубель адзіным плацежным сродкам, *"нужные России газо- и нефтепроводы (якія належаць пакуль Беларусі. —* **Аўт.**) *могут и должны стать нашим ответным даром"*.

Спадары Сініцын і Парфяновіч лічаць мэтазгодным *"законным путем (в порядке, предусмотренном Конституцией, законами и международными договорами) обеспечить вхождение Республики Беларусь в качестве суверенного государства в состав Российской Федерации на правах ассоциированного субъекта"*. Заўважце, размова ідзе ўжо не пра беларуска-расійскае яднанне, а пра ўваходжанне Беларусі *"в состав Российской Федерации"*. І пра які ж суверэнітэт пры гэтым можна гаварыць?!

Л.Сініцын і У.Парфяновіч хочуць стварыць новы Савецкі Саюз? Дзесяткі іншых пытанняў узнікае, калі чытаеш іх "Минский манифест...". І галоўнае з іх — ці гэта не спецыяльна задуманая правакацыя? З тым каб канчаткова пахаваць не толькі *"белорусско-российское единение"*, але і нагул добрасуседскія сувязі паміж дзвюма краінамі.

Казімір КУНЦЭВІЧ.

Китай построит в Беларуси больницу

Китайская Народная Республика выделит 30 миллионов юаней на строительство больницы в одном из районов Беларуси, пострадавших от аварии на Чернобыльской АЭС. Китайской стороне уже предложено на выбор несколько мест в Брестской, Могилевской и Гомельской областях, но, вероятнее всего, это учреждение здравоохранения будет построено на Гомельщине.

Хотите поступить в вуз?

2 мая в Беларуси стартовала вступительная кампания. С этого дня началась регистрация абитуриентов для прохождения централизованного тестирования, сообщили БелаПАН в Республиканском институте контроля знаний (РИКЗ).

Подать документы абитуриенты могут до 1 июня. Пункты регистрации будут работать с 8.00 до 20.00 ежедневно, кроме воскресений, а также в выходной день 27 мая.

Централизованное тестирование будет проходить с 12 по 28 июня по 11 общеобразовательным предметам.

Согласно правилам поступления, прием документов в так называемые силовые и творческие вузы пройдет с 5 по 16 июля. Во все иные государственные и частные вузы страны (кроме заочной и вечерней форм в вузах сельскохозяйственного профиля) на все формы обучения прием документов будет осуществляться с 12 по 29 июля (на военные факультеты — с 12 по 26 июля).

АБЗАЦЕМ

«Пехлеван» — это наш МАЗ

В Азербайджане начинается сборка автомобилей Минского автозавода. Предполагается, что в Азербайджане будет производиться 10 модификаций автомобилей "МАЗ". В текущем году планируется собрать более 250 машин. Сборка организована на Гянджинском автомобильном заводе. Всего в перспективе ежегодно планируется производить до тысячи автомобилей. По информации азербайджанской стороны, наряду с брендом "МАЗ" им будут присваиваться и азербайджанские названия. К примеру, "МАЗ-631705" будет называться "Пехлеван" ("Богатырь"), два вида других автомобилей будут названы в честь города Гянджи.

Совместный прорыв

Открытые акционерные общества "Белкард" и "Гродненский завод автомобильных агрегатов" готовятся к объединению. Таково решение Гродненского горисполкома. Гродненское ОАО "Белкард" специализируется на выпуске карданных валов к наземным транспортным средствам. В уставном капитале ОАО государству принадлежит 66% акций, частному капиталу — 25,9%, иностранным участникам — 0,6%, прочим участникам — 7,5%. Гродненский завод автомобильных агрегатов — одно из старейших предприятий Республики Беларусь. Был основан в 1884 году как небольшая ремонтная мастерская предпринимателей Боровских. Сейчас ОАО выпускает амортизаторы, газовые пружины и тормозные камеры для автомобилей. Доля государства в ОАО составляет 99,49%.

Сбор 19 мая

Учредительную конференцию республиканского общественного объединения "Ликвидатор" планируется провести в Минске 19 мая. Как сообщил инициатор создания новой организации фельдшер высшей категории из Жодино (Минская область) Александр Волчанин, для этих целей организаторы арендуют помещение в Республиканском Дворце культуры Белорусского общества глухих.

Рекордный бросок Тихона

Чемпион мира в метании молота Иван Тихон отличился на турнире на призы Евгения Шукевича в Бресте. Известный спортсмен в одной из своих попыток метнул снаряд на 81 м 18 см, что является лучшим результатом нынешнего мирового сезона.

По материалам информагентств.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Быль і боль «Чарнобыльскага Шляху»

У Мінску на мінулым тыдні прайшоў чарговы "Чарнобыльскі Шлях". Не абышлося без сутыкненняў з міліцыяй

У першую чаргу — ахова «Чырвонага дома»

Напярэдадні "Чарнобыльскага Шляху" намеснік памочніка Дзяржсакратара ЗША Дэвід Крамер, які сустракаўся ў Мінску з прадстаўнікамі беларускай улады, паставіў перад апошнімі ўмову: *"Правядзенне акцыі, прыўрочанай да 21-й гадавіны чарнобыльскай трагедыі, павінна быць цывілізаваным"*.

Натуральна, што ў першую чаргу прыклад павінны былі падаваць арганізатары акцыі, і яны, як павінна быць, 4 красавіка падалі ў Мінгарвыканкам заяўку, згодна з якой шэсце 26 красавіка павінна было пачацца а 18-й гадзіне ад плошчы Якуба Коласа. Праўда, гарадскія ўлады без узгаднення з заяўляльнікамі перанеслі месца збору ля Акадэміі навук. У судзе гэта матывалася тым, што *"арганізатары самі адмовіліся ўзгадняць з імі змены ў маршруце"*. З гэтага можна было толькі пасмяяцца.

...А ўлады пачалі рыхтавацца ў гэты дзень да "Чарнобыльскага Шляху" яшчэ з самага ранку. Асабліва ў раёне Адміністрацыі прэзідэнта, як быццам збор народу на "Шлях" павінен адбыцца менавіта там, ці дэманстранты збіраліся штурмам браць *"Чырвоны дом"*. На вуліцах, якія прылягалі да Адміністрацыі, ледзь не праз метр стаялі даішнікі ды месціліся знакі *"Прыпынак забаронены"*. Няцяжка было "вычленіць" сярод людзей і сілавікоў у цывільным, якія "назіралі за парадкам" па сваёй праграме.

Цырк прыехаў!

Бліжэй да абеду стала зразумела, што сілавыя структуры "прыпаркавалі" свае значныя сілы і ў вулачках, якія прылягаюць да праспекта Скарыны. Карэспандэнты "Народнай волі", якія выйшлі да месца акцыі за дзве гадзіны да яе пачатку, раскрылі амаль усе замаскіраваныя і незамаскіраваныя месцы дыслакацыі "блюстителей закона".

Нягледзячы на тое, што збор удзельнікаў "Чарнобыльскага Шляху" быў прызначаны ля Акадэміі навук, сумнавядомы брыгадны камандзір спецназа Дзмітрый Паўлічэнка са сваімі байцамі заняў пазіцыю на набярэжнай Свіслачы ля цырка. Уся набярэжная была застаўлена машынамі са спецназаўцамі, якія бы тыя алавяныя салдацікі акуратненька сядзелі ў тэнтаваных машынах, закрыўшыся шчытамі. Сам *"чорны палкоўнік"* у гэты час нешта актыўна абмяркоўваў з чалавекам у цывільным, разпораз рассякаючы паветра далонню. Магчыма, праводзіў рэпетыцыю *"вечернего досуга"*.

Ля ўваходу ў парк Горкага таксама знаходзілася некалькі *"рэйсавых"* аўтобусаў з міліцыяй, стаялі больш салідныя спецмашыны, у невялікім *"козліку"* вадзіцель-міліцыянер пачытваў анекдоты, час ад часу вяла ўздрыгваючы ад смеху. Было бачна, што ў машыне спякотна, а міліцыянеру сумна.

А вось у дварах бліжэй да плошчы Якуба Коласа сілавікоў было, што бруду ў балоце. У дварах, за дварамі, нават трактары і то ездзілі міліцэйскія. Натуральна, што ўсе шляхі, каб выйсці на плошчу, былі перакрыты міліцыянерамі і "грамадзянскімі". Магазіны і кафэ ў гэтым раёне таксама былі зачынены.

— Мне трэба дахаты прайсці, — прыводзіла аргументы ім нейкая жанчына, якая некалькі хвілін старалася прарвацца праз "заслон".

— Праз дзве гадзіны пройдзеце, — у рэжыме аўтаадказчыка чулася ёй у адказ.

— А каб вы правaліліся!..

Месца сустрэчы змяніць нельга

Каб патрапіць да Акадэміі навук, трэба было альбо вяртацца на плошчу Перамогі (там можна было сесці на метро, альбо, калі пашэнціць, убіцца ў 100-ы аўтобус) ці ісці да Акадэміі навук, робячы добрую *"каўбасу"* па Гікала, Платонава з выхадам на Сурганава.

Мы не шукалі лёгкіх шляхоў і акурат а 18-й гадзіне выйшлі да Акадэміі навук. На той час там было народу зусім няшмат — усяго некалькі тысяч чалавек (разоў у пяць менш, чым, як нам здавалася, сілавікоў, якіх мы сустрэлі па дарозе). У натоўпе можна было заўважыць транспаранты "За свабоду!", "Беларусь без АЭС", "Свабоду Казуліну!", "За альтэрнатыўную энергію"... Моладзь была апранута ў сінія майкі з надпісамі "За свабоду!", каларытным выглядаў чалавек у процівагазе і дзяўчына ў ліфчыку з надпісам на жываце "Нет — АЭС!". Многія маладыя людзі былі салідарны з дзяўчынай і стараліся як мага бліжэй разгледзець актуальны надпіс.

Ля будынка Акадэміі навук былі заўважаны Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Станіслаў Багданкевіч, Валерый Фралоў, Аляксандр Мілінкевіч... Апошні прыйшоў падтрымаць дэманстрантаў толькі да Акадэміі навук, аднак не захацеў ісці на плошчу Бангалор.

Народ таптаўся на месцы, не ведаў, што рабіць, у натоўпе пачулася: "Гукаўзмацняльная апаратура недзе згубілася".

А вось гукаўзмацняльная апаратура міліцыі працавала як след.

— У гэтым месцы збор забаронены, правядзенне мітынгу дазволена на плошчы Бангалор, — рэгулярна чулася з рупара.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

ЧУЖОЙ КОШЕЛЕК

Сколько зарабатывают чиновники?

Министерство труда и социальной защиты обнародовало должностные оклады некоторых государственных служащих

Например "голый оклад" советника председателя Комитета государственной безопасности составляет 655 тысяч белорусских рублей.

Начальники управления департамента Министерства внутренних дел и Министерства по чрезвычайным ситуациям за должность получают 697 тысяч, начальник отдела Мингорисполкома — 612 тысяч рублей.

Должностные оклады работников центрального аппарата прокуратуры Республики Беларусь немного повыше.

Так, начальник управления прокуратуры имеет оклад размером 966 тысяч белорусских рублей, начальник отдела — 874 тысячи, старший следователь по особо важным делам и старший помощник прокурора — 813, помощник следователя — 517 тысяч рублей.

Прокурорам платят больше. Как сообщает Минтруда, должностные оклады прокуроров Белорусской транспортной прокуратуры и прокуратуры Минска равняются 1 миллиону 12 тысячам белорусских рублей. Для сравнения — оклад прокурора районной прокуратуры Минска — 736 тысяч рублей.

Оклад директора госучреждения "Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка прокуратуры Республики Беларусь" — 966 тысяч, его зама — 896, помощника директора — 702 тысячи рублей.

ЭТО МНОГО ИЛИ МАЛО?

Александр СОСНОВ, экс-министр труда и социальной защиты:

— Минтруда назвало лишь должностные оклады чиновников, — говорит Александр Викторович. — Чтобы узнать примерный размер их зарплаты — умножайте оклад на два. Много это или мало? Смотря о чем речь. На мой взгляд, чиновники должны получать достаточно много, чтобы не брать взятки. Поэтому это — мало. Хотя если учитывать, что уровень средней заработной платы по стране на порядок ниже, то это даже многовато. Но прислужникам платить надо, иначе они любого царя сдадут...

Георгий БАДЕЙ, руководитель Белорусского союза предпринимателей и нанимателей имени профессора Макса Кунявского:

— Позвольте мне ответить на этот вопрос уклончиво. Для того, кто получает — всегда мало. А для того, кто платит — всегда много.

Минтруда приводит только оклады госслужащих, но доплаты за стаж, классность и прочее существенно меняют всю картину...

Мне в бытность председателя Госкомтруда приходилось работать над этими вопросами. Помню, на одном из семинаров по линии Международной организации труда мы спрашивали, как должна быть организована система оплаты труда, в том числе для чиновников. И компетентные люди нам говорили, что к оплате труда чиновников надо подходить очень взвешенно. Чтобы трудящиеся, которые платят налоги, были не в худшем положении, чем чиновники. То есть средняя заработная плата чиновников не должна намного превышать среднюю зарплату наемных работников. А вот представители частного бизнеса могут иметь заработную плату гораздо выше, чем у чиновников. Я не люблю заглядывать в чужой карман, но мне кажется, что у нас это "правило приличия" не всегда выдерживается по отношению к действующей тарифной ставке.

Владимир ХОМИЧ, доктор юридических наук, директор госучреждения «Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка прокуратуры Республики Беларусь»:
«Оснований для повышения зарплаты чиновникам нет...»

"Народная воля" попросила рассказать Владимира Михайловича, из чего состоит его зарплата.

— Никаких секретов нет, — ответил уважаемый профессор. — Недавно нам немного повысили оклады и сейчас, как вы знате, мой оклад — 966 тысяч белорусских рублей, хотя еще недавно был примерно 819 тысяч. В соответствии с действующими нормативами, мне, как находящемуся на научно-педагогической работе, зачли десять лет в стаж госслужбы. Если не ошибаюсь, то за стаж в госслужбе мне доплачивают до 20 процентов от оклада. Плюс 10 процентов — за ученую степень доктора юридических наук и еще плюс за класс государственного служащего. Вот и все.

Много это или мало? С точки зрения средней заработной платы в Республике Беларусь это и не много, и не мало. Некоторые люди получают гораздо меньше.

С моей точки зрения, зарплата государственных служащих сейчас, в общем-то, не столь высока, как, например, на некоторых предприятиях. Самая высокая заработная плата сейчас в строительном комплексе. Знаю, что у некоторых строителей в месяц выходит до двух миллионов в месяц.

Но я полагаю, что в наших условиях оснований для повышения зарплаты чиновникам нет.

Для сравнения: когда я работал профессором, то у меня была ставка 788 тысяч рублей, к этому доплачивали за ученую степень доктора наук — 6 базовых величин, за стаж — еще 15 процентов, надбавку за хорошие показатели работы в пределах 5—10 процентов (но эту надбавку далеко не всем выплачивают, зависит от стажа и характера выполняемой работы). Отсюда и получается средняя зарплата профессора — примерно миллион сто с хвостиком...

КОПЕЙКА К КОПЕЙКЕ...

За что еще могут доплачивать?

Как сообщает Минтруда, руководители Министерства обороны, Министерства внутренних дел, системы органов госбезопасности, Госкомитета погранвойск и Министерства по чрезвычайным ситуациям в пределах фонда заработной платы могут выплачивать надбавку за стаж работы по специальности.

Специалистам и служащим оперативных подразделений органов государственной безопасности, подразделений по гражданству и миграции и оперативных подразделений органов внутренних дел могут ежемесячно доплачивать за знание иностранных языков. За звание одного — 10 процентов от тарифной ставки первого разряда, двух европейских или одного восточного или африканского — 15 процентов, трех и более европейских или нескольких иностранных, один из которых восточный или африканский — 25.

Также надбавки устанавливают за высокие творческие, производственные достижения в работе, сложность и напряженность труда, а также за выполнение особо важных (срочных) работ в размере до 50 процентов оклада.

БЛИЦ

Довольны ли Вы своей зарплатой?

Александр КЕРНОЖИЦКИЙ, начальник финансового управления Мингорисполкома:

— А разве бывают люди, которые довольны своей зарплатой?

Марина БАЗЫЛЕВА, докторант кафедры экономической теории и истории экономических учений учреждения "Белорусский государственный экономический университет", кандидат экономических наук, доцент:

— Я сейчас в докторантуре, поэтому мой ответ будет позитивным, поскольку у меня теперь стипендия больше, чем зарплата. Не намного, но тем не менее. Это стимулирует заниматься наукой. Но вообще, конечно, хотелось бы больше...

Анна КОНДРАТЕНКО, врач-стажер:

— Как молодой специалист я получаю всего 200 тысяч белорусских рублей. Как вы понимаете, на эти деньги прожить очень сложно, даже покупая самое необходимое. Хорошо, что муж работает в частной структуре — он зарабатывает около миллиона. Как с нашими заработками скопить хотя бы на однокомнатную квартиру — не знаю...

Александр ПОБЕДИНСКИЙ, помощник председателя Мингорисполкома:

— Доволен. Пока все устраивает.

Людмила КУРЕВИЧ, страховой агент:

— Не устраивает. В минувшем месяце на процентах от страховки получила лишь 300 тысяч. Разве эта сумма может устраивать?

Галина КАСПЕРОВИЧ, доцент кафедры философских наук Академии управления при президенте Республики Беларусь, кандидат философских наук:

— В принципе, довольна. У нас в вузе нагрузки все увеличиваются, зарплата пока не уменьшается. Грех жаловаться.

Екатерина ПУСТОВОЙТ, менеджер:

— Не довольна. Год назад родила ребенка, но чтобы не потерять работу, пришлось досрочно выйти из декретного отпуска. Фактически работаю только на няню, живем за зарплату мужа, естественно, нам помогают родители...

Марина КОКТЫШ.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Быль і боль «Чарнобыльскага Шляху»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Старт

І ў 18.36 удзельнікі "Чарнобыльскага Шляху" выстраіліся ў калону. З міліцэйскіх *"мацюгальнікаў"* загучала: *"Калона паварочвае на Сурганава і рухаецца да парку Дружбы народаў"*.

У руках дэманстранты трымалі транспаранты, бел-чырвона-белыя сцягі, сцягі Еўрасаюза. На працягу ўсяго шэсця калона скандзіравала традыцыйнае "Жыве Беларусь!" і "Свабоду!".

На выпадак, калі б удзельнікі акцыі вырашылі ісці па праспекце Незалежнасці да Нацыянальнай бібліятэкі, прадугледжвалася сустрэча з байцамі палка міліцыі спецыяльнага прызначэння. У раёне Беларускай акадэміі мастацтваў стаялі людзі ў шлемах і з дубінкамі. Арганізатары мерапрыемства павялі калону па ўзгодненым з уладамі маршруце. На Сурганава дэманстрантам дазволілі заняць першую паласу, але ненадоўга. Не даходзячы да вуліцы Якуба Коласа, міліцыянты памянялі рашэнне, папрасіўшы ўдзельнікаў "Шляху" трымацца як можна правей, каб не перашкаджаць руху транспарту. Гэтае патрабаванне выканаць было не так проста, бо тратуары ў гэтым месцы адсутнічалі. Дарожныя работы ідуць у раёне вуліцы Якуба Коласа даўно. Замест асфальту на тратуары тут горы камянёў і кучы пяску. Патрабаванне міліцыянтаў выклікала абурэнне ў некаторых маладых людзей, але да затрыманняў справа не дайшла. Ахоўнікі правапарадку абмежаваліся тлумачальнай размовай...

Варта адзначыць, што мінакоў, якія чакалі транспарту на прыпынках, можна было б падзяліць на дзве няроўныя катэгорыі. Першыя — гэта спачуваючыя, якія ставіліся да дэманстрантаў з паразуменнем, выказваючы падтрымку. І другія — замбіраваныя афіцыйнай прапагандай. Бабулька гадоў сямідзесяці падбегла да карэспандэнта "Народнай волі" з пытаннямі: *"Ну што ты тут ходзіш? Долары адпрацоўваеш? Колькі табе заплацілі?"* Мужчына з калоны спытаўся, адкуль бабулька ведае *"пра долары"*. Тая, як на духу выпаліла: *"Дык жа ж па тэлевізары пра гэта гавораць"*. І паспела дадаць, што пенсіі ў 198 тысяч ёй на малако з хлебам хапае...

Да Чарнобыльскай капліцы, што на вуліцы Карастаянавай, калона дайшла без здарэнняў. Тут і распачаўся жалобны мітынг.

Маўклівы мітынг

Трэба аддаць належнае арганізатарам, на мітынгу ніякіх палітычных лозунгаў не гучала. Можа, яно і правільна — нагода не тая. Старшыня аргкамітэта "Чарнобыльскага Шляху-2007" прафесар Іван Нікітчанка зачытаў рэзалюцыю, якую прыняў аргкамітэт. Гэтыя тэзісы павінны былі агучыць яшчэ ля Нацыянальнай акадэміі навук, аднак там, як мы ўжо казалі, не аказалася гукаўзмацняльнай апаратуры. Патрабаванні арганізатараў шэсця былі наступныя: адмена ўсіх указаў, якія супярэчаць Закону "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС"; аднавіць усе правы на льготы; аднавіць усе спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы, у тым ліку Інстытут радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі, стварыўшы філіялы ва ўсіх абласцях; правесці дыспансерызацыю ўсяго насельніцтва краіны; аднавіць у поўным аб'ёме сістэму радыяцыйнага кантролю прадуктаў харчавання і навакольнага асяроддзя; адмяніць усе абмежаванні на гуманітарную дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў і фондаў; неадкладна даць станоўчы адказ на прапановы Еўрасаюза і зрабіць канкрэтныя крокі для дэмакратызацыі, пачатку сістэмнага супрацоўніцтва з аб'яднанай Еўропай у эканамічнай, энергетычнай, чарнобыльскай і іншых галінах.

Пасля гэтага айцец Вікенцій зачытаў малітву "За Беларусь". Затым адзін з арганізатараў "Чарнобыльскага Шляху-2007" Вінцук Вячорка сказаў, што памяць аб трагедыі страшнай тэхнагеннай катастрофы будзе ўшанавана 21 ударам у звон, які прынеслі з сабой маладзёжныя актывісты. Мітынг скончыўся выканаННем гімна "Магутны Божа" і запальваннем свечак ля Чарнобыльскай капліцы.

Цікава, што на мітынгу прысутнічалі мінгарвыканкамаўскія ідэолагі. Яны стаялі асобна ў баку. І адзін, напэўна начальнік, распякаў падначаленых: "Што ж гэта такое?! Куды вы глядзелі? Чаму тут так шмат моладзі?!" Пытанне і сапраўды рытарычнае.

Хапун

Мітынг скончыўся прыкладна ў 20.15. Людзі пачалі разыходзіцца. Але пазбегнуць сутычак з міліцыяй, на жаль, не ўдалося. Група маладых людзей выходзіла з парку Дружбы народаў і паспрабавала дастаць нацыянальныя сцягі. Напачатку ўсё было спакойна. Карэспандэнт "Народнай волі" ў гэты момант знаходзіўся побач з камандзірам палка міліцыі спецыяльнага прызначэння Юрыем Падабедам і асабіста чуў, як Юрый Мікалаевіч аддаваў загад наступнага зместу: *"Нікога не чапаць! Нікога не біць! Выцясняць людзей толькі жыватамі!"*. Але пакуль Падабед паспеў перабегчы на супрацьлеглы бок, бойка ішла поўным ходам. Міліцыянеры вырывалі ў маладых дзяўчат сцягі, білі нагамі і цягнулі ў аўтобусы. Аднаго маладога чалавека двое *"людзей у чорным"* схапілі і быццам тушу перакінулі праз агароджу, якая раздзяляе дарогу. Праз некалькі секунд ён быў зацягнуты ў аўтобус... Сведкі патасоўкі адзначаюць асаблівую жорсткасць ахоўнікаў парадку. Падчас *"зачысткі"* натоўп скандзіраваў *"Фашысты!"*, *"Бандыты!"*.

Па ўдакладненых дадзеных, пасля сутычкі з міліцыяй было затрымана 16 чалавек. Іх даставілі ў РАУС Цэнтральнага раёна. Аднак праз некаторы час яны ўсе былі адпушчаны на свабоду.

Алесь СВЯТЛАНІЧ, Віталь ГАРБУЗАЎ.

РЭГІЁН

Жалобны звон

У Віцебску ў дзень 21-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС супрацоўнікі міліцыі затрымалі мясцовага апазіцыянера і распаўсюджвальніка незалежнай прэсы Барыса Хамайду.

Ён стаяў у цэнтры горада, ля так званага "сіняга дома" на вуліцы Леніна, і ў знак жалобы званіў у сімвалічны звон. Побач з ім была ўстаноўлена шыльдачка з надпісам "Памінальны звон па ахвярах Чарнобыля". На галаве апазіцыянера была чорная стужка, на грудзях прымацаваная такая ж стужка і значок чорнага колеру з выявай бел-чырвона-белага сцяга і надпісам "Свабода".

Акцыя доўжылася не больш за пяць хвілін: столькі, колькі спатрэбілася міліцэйскаму аператару, каб зафіксаваць на камеру тое, што адбываецца. Але што такога незаконнага рабіў Хамайда?

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

АКЦЫЯ

Нават праваслаўныя не вытрымалі

За пяць дзён у Мінску сабрана прыкладна 3,5 тысячы подпісаў за ўнясенне змяненняў у Закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях". Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН паведаміў юрыст мінскай царквы "Новае Жыццё" Аб'яднання абшчын хрысціян поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь Сяргей Луканін.

Паводле яго слоў, пакуль не паступілі звесткі з рэгіёнаў аб ходзе кампаніі. "*Аднак мы можам канстатаваць, што кампанія ідзе актыўна, бо пастар адной з цэркваў нашага аб'яднання ў Баранавічах днямі быў запрошаны да намесніка старшыні гарвыканкама па ідэалогіі*", — паведаміў юрыст.

Паводле яго слоў, арганізатары кампаніі разлічваюць сабраць не менш за 50 тысяч подпісаў пад адкрытым зваротам да кіраўніка дзяржавы, да Канстытуцыйнага суда, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з заклікам прывесці ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь Закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях", што дзейнічае з канца 2002 года.

Да кампаніі падключаюцца розныя дэнамінацыі хрысціянства, у тым ліку пратэстанты, каталікі і праваслаўныя. Так, на прэс-канферэнцыі, праведзенай ініцыятарамі кампаніі ў сталіцы, праваслаўны святар Свята-Пакроўскай царквы айцец Аляксандр Шрамко падкрэсліў, што хрысціяне пазбаўлены законнай магчымасці збірацца па дамах для чытання Біблії і малітваў, а таксама сутыкнуліся з вялікімі перашкодамі ў дзейнасці нядзельных школ. Паводле яго слоў, закон абмяжоўвае дзейнасць найбольш актыўных праваслаўных прыходаў, якія хочуць займацца місіянерскай дзейнасцю і пашыраць свой уплыў у грамадстве.

Ігар МАРОЗАЎ.

Іна Кулей патрабуе ўзбуджэння крымінальнай справы

Іна Кулей — кіраўнік камітэта дапамогі рэпрэсаваным "Салідарнасць" і жонка старшыні Палітсавета аб'яднаных дэмакратычных сіл Аляксандра Мілінкевіча — звярнулася з заявай у пракуратуру Мінска. Як паведамляе прэс-служба А.Мілінкевіча, І.Кулей просіць распачаць крымінальную справу па факце размяшчэння на сайце intimby.net у раздзеле "знаёмства" анкеты аб прадастаўленні платных інтымных паслуг з яе кантактнай інфармацыяй.

"З моманту размяшчэння дадзенай аб'явы мне неаднаразова тэлефанавалі на мабільны тэлефон з прапановамі інтымнага характару. Вельмі часта тэлефанаванні насілі абразлівы характар. Размяшчэнне дадзенай аб'явы з пазначэннем майго мабільнага тэлефона носіць наўмысны характар і накіраванае на абразу мяне і паклёп", — гаворыцца ў заяве.

Іна Кулей таксама лічыць, што такая інфармацыя скіравана на дыскрэдытацыю яе як грамадскага дзеяча і жонкі лідэра дэмакратычных сіл.

Дарэчы, Іна Кулей не першая, каго спрабуюць выбіць з каляіны такімі брудныміметадамі. І ніводнага разу міліцыя не тое што не знайшла вінаватых, а нават і не шукала.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

Размеркаванне — у Расію

14 беларусаў — выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту атрымалі размеркаванне на працу на прадпрыемствы і ў арганізацыі Расійскай чыгункі. Размеркаванне праходзіла з удзелам начальніка Беларускай чыгункі Уладзіміра Жарэлы.

Дарэчы, чатыры расіяніны пасля атрымання дыплома па асабістым жаданні застануцца працаваць у Беларусі.

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

Унікальнае Пяцікніжжа Маісеевае з'явілася ў Пінску

Англійскі бізнесмен Давід Гірш падарыў пінскай іудзейскай рэлігійнай абшчыне новую Тору. Як паведаміў БелаПАН старшыня абшчыны Іосіф Ліберман, урачыстая цырымонія ўнясення новай Торы ў сінагогу адбылася 30 красавіка. *"Новая Тора унікальная, — падкрэсліў І.Ліберман. — Яна не проста надзвычай прыгожая. Пяцікніжжа Маісеевае напісана адным з лепшых у Ізраілі сайферaў (перапісчыкаў), які вырабіў з розных відаў арахісу спецыяльныя чарнілы і працаваў над заказам цэлы год, старанна выводзячы кожную літару. Не забыў ён і традыцыю, згодна з якой некалькі сказаў у тэкст Торы павінны ўпісаць знаныя яўрэі. У дадзеным выпадку такую ганаровую місію выканаў адзін з найаўтарытэтных дзеячаў Ізраіля — рэб Хаім Канеўскі"*.

На святочнае мерапрыемства, дарэчы, прыехала шмат гасцей з Беларусі, краін далёкага і блізкага замежжа. Сярод іх — галоўны равін Вялікабрытаніі.

Галіна ЗАГАДСКАЯ.

ЛИЧНЫЕ ВПЕЧАТЛЕНИЯ

Шлях к свободе

Людмила ГРЯЗНОВА

...Вдруг снова ожили минские улицы. К шести часам вечера по проспекту Скорины (никакое другое название не заменяет имени белорусского первопечатника) пошли люди с одинаково дружелюбными и одухотворенными лицами. Даже не зная друг друга, они переглядывались и приветствовали тех, кто ехал, зажатый в тесных автобусах сотого маршрута. Ожившая кровеносная система города в виде гордо шествующих достойных граждан создавала удивительную атмосферу европейского свободного города.

Каждый, самостоятельно шествующий к Академии наук, переживал не только положительные эмоции, но и преодолевал какие-то свои внутренние преграды. О страхе, наверное, уже нет и речи. Однако сделать шаг в сторону неизвестного — всегда маленький подвиг отдельного маленького человека. С какой радостью шествовали они — герои минских улиц — и как им завидовали те, кто остался сидеть дома или в комнатах общежитий, кто ехал в мимо проходящем транспорте.

Живые ручейки слились друг с другом на площади возле Академии наук. И это не только метафора, это реальное состояние ожившего общества, людей с открытыми сердцами, с искренним интересом к любому, рядом стоящему человеку. Как не похоже это "комьюнити" на то, каким обычно изображается белорусское общество — якобы отчужденное, завистливое и озлобленное. Ничего похожего на этот избитый стереотип не наблюдалось. Другая Беларусь стояла на площади!

Как замечательно потом пошли свободные граждане будущей страны под национальными знаменами Беларуси и флагами Евросоюза! Сочетание бело-красно-белого и синего с золотым создает не только эстетическую гармонию, но и ощущение европейской Беларуси, интегрированности страны в западную цивилизацию без потери собственного национального лица. Даже рядом идущие работники ГАИ, одетые в свою сине-желтую форму, вписывались в общую цветовую гамму колонны. С их стороны не наблюдалось явных проявлений грубости, их поведение можно назвать лояльным и уважительным.

Пройдя "Чарнобыльскі Шлях" до каплицы, участники шествия, которых по оценкам журналистов и очевидцев было не менее семи тысяч, вольно расположились возле мемориального здания. Многие держали в руках зажженные свечи, тихо опустив головы, молча, повторяя молитву за Беларусь. Кто-то потом собирал подписи за свободу вероисповедания, за сохранение памятников старины, не обращая внимания на снующих в массе людей крепких, бритоголовых работников с наушниками за воротом. Может быть, это и стало причиной необъяснимой ярости черноголовых спецназовцев, набросившихся на мирно расходившихся демонстрантов с бело-красно-белыми стягами? Кому-то наверху хотелось показать себя этаким крутым парнем, который остается первым на деревне?

Все, кроме последнего эпизода, выглядело достойно и человечно. Другого пути у нас — граждан этой страны — как выходить собственными ногами свою свободу и независимость, нет. Двадцать первый "Чарнобыльскі Шлях" еще раз доказал эту непреложную истину.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

ПАЛІТКУХНЯ

Вячаслаў ОРГІШ, доктар філасофскіх навук

1. Хто таўчэ ваду ў ступе?

Сярод беларускіх дэмакратаў — эйфарыя. Нарэшце апазіцыйныя лідэры, што ўваходзяць у Палітсавет аб'яднаных дэімакратычных сіл (АДС), дамовіліся дзейнічаць як адно цэлае. 11 красавіка сабраліся ў Вільнюсе на канферэнцыю і заключылі пагадненне. Адсунулі ў бок амбіцыі, групавы эгаізм і вырашылі, што надалей — толькі разам, раскол у шэрагах дэмапазіцыі — рэч недапушчальная. Прынята рашэнне паспрабаваць іншую стратэгію.

Аднак ці так усё проста? Ці не заўчасна радуемся?

Эпіцэнтр усіх спрэчак

Сапраўды Вячорка, Калякін, Лябедзька, Ляўковіч, Мілінкевіч, Шушкевіч (не кажучы ўжо пра палітычных ліліпутаў), прыпёртыя да сцяны, пагадзіліся на ўзгодненае правядзенне Кангрэса і пераход да новай стратэгіі барацьбы. Можна пляскаць у далоні. Аднак зазірнём за кулісы. 20 і 23 сакавіка адбыліся рабочыя пасяджэнні Палітрады, а таксама "круглы стол", на якіх абмяркоўваліся дэталі правядзення Кангрэса і распрацоўкі новай стратэгіі. Адно з асноўных назіранняў — супярэчнасці, амбіцыі, групавы эгаізм яшчэ не зніклі, унутрыкааліцыйныя спрэчкі толькі прытушаныя. Складаецца ўражанне, што самы дзейсны фактар, які прымушае асноўных ігракоў заставацца разам — вонкавы, калі яго выключыць, усе разбрыдуцца па сваіх кутках.

Паспрабуем зразумець, у чым палягаюць гэтыя супярэчнасці, а таксама новы стратэгічны курс, пераход да якога прапануюць змагары за дэмакратыю? Ці варта адмаўляцца ад старых падыходаў толькі таму, што папярэднія вынікі барацьбы нездавальняючыя? Можа, справа ўвогуле не ў стратэгіі, а ў саміх іграках?

Эпіцэнтр усіх спрэчак і супярэчнасцяў удзельнікаў аб'яднанай кааліцыі — пытанне аб старшыні Палітсавета, бо менавіта ён апранае майку лідэра дэмсіл. Хаця, здаецца, больш натуральна было б спрачацца адносна таго, як пераадолець штучную ізаляцыю апазіцыі, якім чынам атрымаць доступ да дзяржаўных СМІ, як дамагчыся дэмакратызацыі выбарчай сістэмы, чым прывабіць на свой бок шырокія электаральныя слаі.

Якія б тэмы ні ўздымалі Мілінкевіч, Калякін, Лябедзька, Вячорка, якія б схемы ні прапаноўвалі, адчуваецца, што ў дадзены перыяд іх (і іх паплечнікаў) у першую чаргу хвалюе тое, як заняць месца наперадзе. Альбо, як не прапусціць наперад канкурэнта. Больш моцнай інтрыгі сярод апазіцыйных дзеячаў сёння, вельмі падобна, не існуе. 20 красавіка Палітсавет амаль чатыры гадзіны тоўк ваду ў ступе, пакуль прызначыў дату правядзення Кангрэса (26—27 мая). Канкурэнты пускалі ў ход самыя розныя хітрыкі, каб толькі сфарміраваць дыспазіцыю, суадносіны сіл, якія дазволяць атрымаць на Кангрэсе персанальную перавагу кожнаму з іх. Поўнага кансенсусу (зразумела, негалоснага) большасць прэтэндэнтаў дасягнула, бадай, толькі ў тым, што Мілінкевіча, які пасля выбараў 2006 года не пажадаў аддаваць майку "адзінага", неабходна "засунуць". Аляксандру Уладзіміравічу, які ў адстаўку не спяшаецца, каб палітычна выжыць, неабходна правесці ў склад дэлегатаў Кангрэса большасць сваіх прыхільнікаў, якія падтрымаюць яго кандыдатуру на пасаду старшыні Палітсавета. Але ж тую самую задачу (толькі на сваю карысць) ражаюць іншыя прэтэндэнты. Яшчэ перад імі (іншымі) стаіць задача мінімум — вызваліць вакансію і замацавацца ў новым статусе. Таму лабіруецца ідэя абрання не старшыні Палітсавета, а сустаршыняў.

Калектыўнае кіраўніцтва, калектыўная адказнасць, як вядома, вядуць да калектыўнай безадказнасці. Такое ўжо праходзілі, толькі, відаць, мінулы вопыт даецца не ўсім. За манеўрамі апазіцыйных дзеячаў, за іх гульнямі вакол галоўнага партфеля лёгка праглядаецца адна фундаментальная праблема — няма сапраўднага лідэра, амбіцыі якога не выклікалі б пярэчанняў большасці палітычнай эліты. Няма асобы, здольнасці і палітычная вага якой дазвалялі б кінуць выклік галоўнаму сапернiку. Няма на абмежаванай партыйна-палітычнай дзялянцы дэмакратаў. Увесь час тасуецца даволі сціплая і зашмальцаваная калода прэтэндэнтаў і нічога не робіцца, каб рэальна пашырыць іх кола. Дамовіліся правесці сем абласных канферэнцый, якія будуць папярэднічаць Кангрэсу. Але перад гэтымі канферэнцыямі (міні-кангрэсамі) не ставіцца задача дапамагчы адшукаць новых лідэраў. Яны павінны толькі прагаласаваць за тыя ці іншыя пункты парадку дня Кангрэса. Напрыклад, абіраць, ці не абіраць старшыню (сустаршыняў) Палітсавета. Калі абіраць, то на Кангрэсе альбо на пасяджэнні Палітсавета.

Партыя БНФ паставіла крыж

Сябры Палітсавета 20 красавіка былі гатовы нават пасварыцца, калі вырашалі: запрашаць на форум у якасці дэлегатаў альбо не пэўныя катэгорыі палітычных актывістаў. У прыватнасці, Станіслаў Шушкевіч, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, патрабаваў не давяраць мандат дэлегата тым асобам, якія ў свой час здрадзілі яго партыі, а потым *"бегалі ў Міноўст з патрабаваннем праверыць яе на наяўнасць адпаведнай колькасці сяброў і пазбавіць рэгістрацыі"*. Але гэта дробязі. У вочы кідаюцца рэчы больш сур'ёзныя. Адсутнічаюць агульназразумелыя крытэрыі і механізм вылучэння дэлегатаў на Кангрэс, якія б далі магчымасць больш ці менш прапарцыянальна прадставіць на ім сацыяльна-дэмаграфічную і рэгіянальную структуру дэмакратычных сіл краіны. Таму дэлегацкі корпус фарміруецца адвольна. Запрашаюць тых, хто сабраў пэўную колькасць подпісаў падчас мясцовых выбараў, хто быў дэлегатам шостага Кангрэса дэмсіл, хто ў свой час насіў значок дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі, каму пашчасціла трапіць у партыйную квоту і г. д. Па сутнасці, падбор дэлегатаў ідзе па прынцыпе карпаратыўна-партыйнай прыналежнасці і лаяльнасці.

Што яшчэ кідаецца ў вочы? Нядбайнае стаўленне да дэмакратычных працэдур і галоснасці. Намеснік старшыні Партыі БНФ Юрый Хадыка запатрабаваў, каб дакументы, якія падрыхтаваны да Кангрэса (так званая "малая канстытуцыя", эканамічная ды сацыяльная праграма і інш.) не абмяркоўваліся на абласных канферэнцыях. Людзі маюць толькі права, прачытаўшы, "накіраваць пісьмовыя заўвагі" распрацоўшчыкам гэтых дакументаў. *"Абмеркаванне на канферэнцыях не толькі не дапушчальна, але і не прымальна"*. Мякка кажучы, дзіўны ўзор дэмакратычнасці. Самае цікавае, што Палітсавет ідэю ветэрана абароны беларускай дэмакратыі не аспрэчыў.

Супярэчнасці, раскол, групавы эгаізм хоць і пастаўлены пад кантроль, але шмат у чым вызначаюць характар палітычных рашэнняў апазіцыі. Узяць хаця б Партыю БНФ. Здаецца, не было больш апантанага і паслядоўнага прыхільніка Мілінкевіча, менавіта фронтаўцы лабіравалі яго кандыдатуру на ролю "адзінага" падчас падрыхтоўкі дэмакратаў да апошняй прэзідэнцкай кампаніі. А сёння... яны ставяць на ім крыж.

Аб праблемах, якія зараз турбуюць дэмакратаў (правядзенне Кангрэса, абранне старшыні альбо сустаршыняў Палітсавета, пераход на новую стратэгію барацьбы), я гаварыў з некаторымі ўплывовымі фігурамі ад апазіцыі. Той жа Юрый Хадыка зазначыў, што шансы Мілінкевіча быць абраным страшынёй Палітсавета "нулявыя". На яго думку, у Вільнюсе *пад ціскам замежных кураторыяў* была дасягнута дамоўленасць папярэдне вырашаць пытанне лідэра праз рэгіянальныя канферэнцыі. Мілінкевіча з такой формулай *"прымусілі пагадзіцца"*, бо яго стратэгія (як і яго аднадумцаў сп.Карнiенкі і сп.Шушкевіча) палягае ў тым, каб як мага больш цягнуць з правядзеннем Кангрэса. Аднак бясконца заставацца экс-кандыдатам *("адзіным")* немагчыма. Захаваць майку лідэра ён мог, каб пагадзіўся з прапановай БНФ сабраць Кангрэс у маі мінулага года, калі ў яго яшчэ заставаўся крэдыт даверу. Аднак Мілінкевіч узяўся ствараць свой незалежны рух "За свабоду!", і фактычна страціў статус лідэра аб'яднаных дэмсіл.

Ідэя Віктара Крываля

Карацей кажучы, "памылка" Мілінкевіча ў тым, што ён, у адрозненне ад лідэраў БНФ, не паверыў, быццам можна двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку. На думку Хадыкі, зараз і Лябедзька, і Калякін маюць поўнае права прэтэндаваць на майку першага нумара. Калі рэгіяналы падтрымаюць *"правільную"* ідэю сустаршынства, то да прэтэндэнтаў далучыцца Вячорка. *"Сёння няма магчымасці скласці з гэтай разнароднай каліцыі адну структуру, якая б падпарадкоўвалася аднаму... За Палітсаветам трэба пакінуць толькі каардынацыйную функцыю... Я вельмі спадзяюся, што дэлегаты Кангрэса абяруць сустаршынь, а не старшыню"*.

Інакш кажучы, задаволяцца аморфным утварэннем, галоўнае для якога існаваць, а не эфектыўна змагацца за ўладу. Бадзяга, якая доўжылася гадамі вакол пытання аб адзіным лідэры, будзе доўжыцца па-ранейшаму. На маю прапанову (падчас інтэрв'ю) пакінуць у ролі *"адзінага"* Мілінкевіча, былы яго гарачы прыхільнік запярэчыў: *"Ды ну, гэта махлярства, чалавек захацеў год паездзіць па замежжы, атрымліваючы ўсюды падтрымку на дэмакратыю... Да сённяшняга дня ў яго няма праграмы, ён толькі стварае схемы, якія паказаць, дык са смеху памрэш..."*

Зусім па іншаму ўспрымае праблему Станіслаў Шушкевіч. Ён пагадзіўся з думкай, што за дамоўленасцю аб правядзенні Кангрэса, дасягнутай сябрамі Палітсавета АДС, хаваецца імкненне пэўных асоб і груповак перашкаджаць кіруючыя паўнамоцтвы, перш за ўсё прыбраць да рук старшынства ў Палітсавеце. *"У асобе Мілінкевіча мы маем спелага кіраўніка, лідэра, папулярнасць якога расце. У яго магчымасцей больш, чым амбіцый. Але ж у нас многа асоб ад палітыкі, якім Пан Бог паклаў, не шкадуючы, амбіцый і мала насыпаў магчымасцяў. Мне здаецца, што менавіта гэта празмерная амбітнасць з'яўляецца адной з галоўных прычын валтузні вакол правядзення Кангрэса, якую мы назіраем"*.

Цікавыя дэталі да характарыстыкі сітуацыі вакол правядзення Кангрэса дадаў выконваючы абавязкі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч. Каб усе суб'екты кааліцыі, лічыць ён, паставілі наперадзе сябе прыярытэты краіны, то хутка зняліся б усе праблемы. А так, на жаль, частка суб'ектаў кааліцыі кіруецца прыярытэтамі сваіх груповак. Пошук пазітыўнай дэмакратычнай альтэрнатывы сітуацыі, якая ўзнікла ў адносінах між Беларуссю і Расіяй — вось чым найперш неабходна заняцца Кангрэсу. А некаторыя апазіцыйныя іракі імкнуцца вырашаць пытанні сваёй асабістай палітычнай кар'еры. Таму на першае месца выступаюць працэдурныя моманты, арыфметыкі (хто ў каго выйграе). Упарта спрачаюцца вакол лідэрства. Але ж гэта дурнота, палітычны працэс сам дае магчымасць здатнаму лідэру праявіцца. А ў нас, паколькі няма такога лідэра, кажуць: давайце збяромся, пагутарым, паспрачаемся і назавём лідэра. Гэта абсалютна не той шлях. Мілінкевіч прыстойны палітык, але ў яго не атрымоўваецца *"бегчы наперадзе падзей"*.

Такім чынам, калі глядзець на жыццё беларускай апазіцыі, сканцэнтраванае вакол правядзення Кангрэса, не заплюшчанымі вачыма, карціна атрымоўваецца зусім не святочная. Якім шляхам вызваліцца ад усей гэтай дробнай мітусні, бруду, арганізацыйнай разбэшчанасці? Існуюць розныя ідэі. Адна з іх належыць Віктару Крывалю, кіраўніку Мінскай абласной арганізацыі БСДП (Г). Ён перакананы: без метаду знакамітага Геракла, які здолеў вычысціць перапоўненыя гноем Аўгіевы канюшні, накіраваўшы прама ў стойла бурны рачны паток, не абысціся. Зразумела, гэта жарт, аднак у кожным жарце ёсць, як сведчыць народная мудрасць, частка праўды...

(Працяг у наступным нумары.)

Госдума России освободила белорусов от двойного налогообложения

Госдума России ратифицировала протокол к российско-белорусскому соглашению об избежании двойного налогообложения в отношении налогов на доходы и имущество.

Как передает информационное агентство "Росбалт", граждане Беларуси, работающие на территории России, отныне будут приравнены к россиянам, а следовательно, будут платить налог по ставке 13%, а не 30%).

Напомним, что, согласно законодательству РФ, налоговыми резидентами являются лица, которые пробыли на территории страны не менее полугода.

Алесь Бяляцкі стаў віцэ-прэзідэнтам

Беларускі праваабаронца Алесь Бяляцкі абраны віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH — The International Federation for Human Rights).

FIDH — адна з найбольш уплывовых у свеце праваабарончых арганізацый са штаб-кватэрай у Парыжы. Яна мае статус назіральніка ў ААН, а таму яе прадстаўнікі маюць магчымасць выступаць на пасяджэннях аанаўскіх і іншых органаў.

Нагадаем, што Алесь Бяляцкі ўзначальваў у Беларусі праваабарончы цэнтр "Вясна", які быў ліквідаваны ўладамі ў 2004 годзе. Але Бяляцкі працягвае сваю дзейнасць у Беларусі, бо дапамога людзям не патрабуе ніякага юрыдычнага афармлення.

Летась Бяляцкі быў узнагароджаны прэміяй імя Сахарава ў Нарвегіі, а ў Чэхіі атрымаў прэмію "Homo homini" ("Чалавек — чалавеку").

Ул.інф.

ДИПКУРЬЕР

Дэвид КРАМЕР:

«Я надеюсь, что более жесткие меры предпринимать не придется...»

Министр иностранных дел Беларуси Сергей Мартынов принимал заместителя помощника Госсекретаря США Дэвида Крамера в МИДе, а заместитель главы Администрации президента Наталья Петкевич пригласила американского гостя в кафе.

"Я думаю, что для нее это была просто возможность напрямую получить информацию о позиции США в отношении Беларуси, — пояснил господин Крамер во время пресс-конференции для представителей независимых СМИ. — *И я использовал эту возможность, чтобы донести нашу позицию"*.

Кстати, по словам Дэвида Крамера, еще в Вашингтоне он проинформировал белорусского посла **Михаила Хвостова**, что на пресс-конференцию в Минске журналисты из государственных СМИ приглашены не будут.

"Год спустя мне снова приятно быть в Минске, и я сделал бы это раньше, если бы не проблемы с визой, — продолжил заместитель помощника Госсекретаря США. — *Ее белорусская сторона долгое время просто не выдавала без объяснения причин. Может быть, обиделась за мой прошлогодний визит в Беларусь"*.

— Чем Ваш нынешний визит отличается от прошлогоднего? — поинтересовались журналисты у высокого американского гостя.

— В феврале прошлого года я на самом деле предупреждал, что если белорусские власти не выполнят наши требования, которые касались проведения выборов, то со стороны США будут приняты соответствующие меры. Президентские выборы, как известно, Соединенные Штаты не признали, совместно с Евросоюзом был составлен список невъездных белорусских чиновников, а также были заморожены их счета. Надеюсь, и сейчас белорусская сторона понимает, что наши слова — не пустые угрозы, и мы на самом деле можем принять ряд новых, более жестких мер по отношению к Беларуси.

— С кем Вы встречались в Минске?

— С представителями власти, оппозиции, правозащитниками, группами студентов, семьями политзаключенных. Белорусским властям были предложены два пути развития наших отношений. Первый, прогрессивный, — это когда в Беларуси будут освобождены все политзаключенные, прекратятся дела в отношении оппозиционных активистов и будет разрешено свободное проведение региональных конгрессов и самого Конгресса объединенных демократических сил. Повторюсь, если эти шаги не будут сделаны, боюсь, что наши отношения еще больше ухудшатся, и мы оставляем за собой право принять более жесткие меры. Хотя пока это вопрос чисто гипотетический. Надеюсь, что такие меры принимать не придется.

— Господин Крамер, не могли бы Вы конкретизировать: что это могут быть за меры?

— Мы можем расширить список невъездных лиц, ввести дополнительные санкции против некоторых белорусских предприятий... Есть еще и другие варианты, и мы готовы усилить давление, если в этом будет необходимость.

— Допустим, белорусские власти сделают ответные шаги... Какую конкретную пользу им это принесет?

— Есть неограниченные возможности улучшить торговые отношения, от этого выиграют все. Мы можем рассмотреть вопрос и смягчить те негативные шаги, которые уже приняты в отношении Беларуси. И это всего лишь несколько примеров. Беларусь в последнее время много говорит о своем стремлении наладить отношения с Западом, но хотелось бы, чтобы от слов переходили к делам...

Алесь СИВЫЙ.

ПРАЕКТ

Ці прыйдуцца беларусам даспадобы пратэрмінаваныя тавары?

У хуткім часе, магчыма, пратэрмінаваныя харчовыя тавары не будуць здымацца з рэалізацыі, а зноў стануць паступаць да пакупнікоў.

Ва ўсялякім выпадку на разгляд дэпутатаў беларускага парламента паступіў Закон "Аб абароне правоў спажыўцоў", і сярод прапанаваных дадатковых мер па абароне інтарэсаў спажыўцоў — права адпаведных дзяржаўных органаў дазваляць рэалізацыю харчовых тавараў пасля заканчэння тэрмінаў іх захавання пры ўмове станоўчых вынікаў экспертызы якасці.

Дарэчы, у многіх краінах, у тым ліку і ў Расіі, ёсць такая практыка, а самі пратэрмінаваныя тавары каштуюць для пакупнікоў значна танней.

"У нас ужо было некалькі выпадкаў, калі пасля экспертызы атрымліваўся неабходны дазвол, і віны працягвалі рэалізоўвацца ў крамах, — распавядае карэспандэнту "Народнай волі" старшыня ГА "Беларускае аб'яднанне абароны спажыўцоў" **Ганна СУША**. — *Што да мяне, то асабіста я катэгарычна супраць такога новаўвядзення. Калі ўказаны канкрэтны тэрмін рэалізацыі тавару, то я б аніякіх дадатковых экспертыз не праводзіла. Не рэалізаваны тавар да ўказанага тэрміну — здымайце з рэалізацыі. Для здароўя пратэрмінаваны тавар, можа, і будзе небяспечным, але ці захаваюцца ў тым тавары складаючыя якасці ў першапачатковым выглядзе? Вось у чым пытанне".*

Алесь СІВЫ.

БІЗНЕС ПА-БЕЛАРУСКУ

Яшчэ аднаго дырэктара адправяць на нары?

*Пракуратура Наваполацка распачала следства па крымінальнай справе, узбуджанай у дачыненні да дырэктара мясцовага завода бялкова-вітамінных канцэнтратаў **Эдуарда САНАРА**.*

Кіраўнік прадпрыемства, якое ўжо не першы год нясе буйныя страты і трывала знаходзіцца ў ліку адстаючых, падазраецца ў злоўжыванні службовым становішчам з наступным разбазараваннем заводскіх сродкаў.

Летась, даводзіць пракуратура, Эдуард Санар запрасіў для дэмантажу састарэлага абсталявання, разразання і рэалізацыі чорных металаў мінскую прыватную фірму "Кілт", якой з казны прадпрыемства заплацілі аж 85 мільёнаў рублёў. Аднак пракуратура даведалася, што ўсё, зробленае мінчанамі за вялікія грошы, магло амаль задарма і з лепшай якасцю зрабіць віцебскае унітарнае прадпрыемства "Віцебскдругмет", што стала займацца зборам і перапрацоўкай другаснай металічнай сыравіны. Паводле версіі следства, дырэктар завода БВК скарыстаў асабістую ўладу ў карыслівых мэтах і гэтым нанёс прадпрыемству істотную матэрыяльную шкоду.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

I ТАК БЫВАЕ

Наўздагон грабіцелю кінуўся... старшыня райвыканкама

Старшыня Віцебскага райвыканкама Іван ВАЗМІЦЕЛЬ дапамог міліцыі злавіць злачынцу, які абрабаваў бабульку.

Віцебская пенсіянерка Наля Паўлаўна Заўялава атрымала пенсію. Вярталася дадому па вуліцы Савецкай Арміі. Нечакана да жанчыны падскочыў малады хлопец і выхапіў сумку, дзе ляжалі не толькі грошы, але і дакументы. Усё адбылося на вачах у высокага чыноўніка, які выпадкова аказаўся на месцы здарэння. Іван Вазміцель і ягоны падначалены — загадчык гаспадаркі Віцебскага райвыканкама Ігар Трусаў адразу кінуліся наўздагон. А тут і міліцыянты падбеглі. Рабаўнік быў затрыманы.

Як паведамляе прэс-служба УУС Віцебскага аблвыканкама, хлопец і раней сядзеў за крадзеж. Зараз яму пагражае да 8 гадоў зняволення. А бабулька выказвае падзяку людзям, якія ёй дапамаглі.

Ул.інф.

КАНТРАБАНДА

Беларусы перавозілі радыеактыўны уран

Двое грамадзян Беларусі затрыманы ў Літве па падазрэнні ў перавозцы радыеактыўных рэчываў.

"Дзякуючы наяўным апаратыўным даным і дбайнаму нагляду ў схованцы аўтамабіля, на якім ехалі падазроныя, быў знойдзены кантэйнер з надпісам "уран", — паведаміў "Інтэрфаксу" прадстаўнік па друку Вільнюскай акруговай пракуратуры Аляксандрас Юазапайціс.

Па яго словах, цяпер праводзіцца экспертыза на прадмет высвятлення, ці з'яўляецца затрыманы груз небяспечным. Тым часам Вільнюскі ўчастковы суд прыняў рашэнне аб затрыманні перавозчыкаў на адзін месяц.

У праваахоўных органах устрымліваюцца ад каментарыяў да гэтага здарэння, у той час як мясцовыя тэлеканалы паведамляюць, што радыеактыўнае рэчыва магло быць набыта ў Літве, а затрыманыя асобы могуць быць кур'ерамі, а не заказчыкамі перавозкі ў Беларусь радыеактыўнага рэчыва. Літоўскія СМІ нагадваюць, што больш як дзесяць гадоў таму быў высветлены факт крадзяжу касеты з ядзерным палівам з Ігналінскай АЭС. Пазней побач з АЭС, а таксама ў некалькіх раёнах Літвы былі знойдзены часткі ядзернага паліва з гэтай касеты, аднак частка выкрадзенага радыеактыўнага рэчыва дагэтуль не знойдзена. Вось і засвяцілася?..

Алег СНОЎ.

ЧУЛІ?

Паскарэнне...

Беларускія пасажырскія цягнікі на маршруце Брэст—Масква ў бліжэйшы час будуць рухацца з хуткасцю 140 км/г.

Пра гэта ў Гомелі паведаміў начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Жарэла. Па яго словах, ад Брэста да расійскай мяжы цягнікі змогуць рухацца з хуткасцю 140 км/г, а на шматлікіх перагонах, асабліва на ўчастку Брэст—Баранавічы, можна будзе развіваць хуткасць і да 160 км/г.

Рух у гэтым напрамку будуць здзяйсняць новыя электравозы падвойнага току. Цяпер яны праходзяць абкатку і неўзабаве пачнуць сталае курсіраванне. Нагадаем, дагэтуль на маршруце Брэст—Масква цягнікі маглі развіваць хуткасць не больш за 120 км/г, інфармуе БЕЛТА.

У Беларусі пачынаецца вясновы прызыў

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны, для праходжання тэрміновай ваеннай службы на пасадах салдат і сяржантаў вясной-летам гэтага года на ўкамплектаванне Узброеных сіл, іншых вайсковых фарміраванняў плануецца прызваць каля 10 тысяч чалавек і на службу ў рэзерве — каля трох тысяч.

Вывучэнне і адбор грамадзян, якія падлягаюць прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, будзе ажыццяўляцца з 22 мая па 29 чэрвеня ваеннымі камісарыятамі краіны, а таксама прадстаўнікамі вайсковых часцей Узброеных сіл, унутраных войскаў МУС, пагранічных войскаў і вайсковых фарміраванняў КДБ. Адпраўку ў войскі маладога папаўнення намечана ажыццявіць з 16 па 31 ліпеня 2007 года.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Гаруйце, нямыцькі!

Больш за год жыхары Свіслачы не могуць дапрасіцца ў раённых улад адрамантаваць у пасёлку лазню.

Напрыканцы XX стагоддзя прадстаўнічая і аўтарытэтная камісія ў складзе ўпаўнаважаных адказных спецыялістаў санэпідэмстанцыі, Міністэрства надзвычайных сітуацый і шэрагу іншых устаноў, якіх цяпер на нашы галовы хоць гаць гаці, употайкі ад шырокіх народных мас зачынілі адзіны апошні санітарна-гігіенічны аб'ект у Свіслачы, карацей кажучы, лазню. Забедавалі мясцовыя небаракі, а што як усчыніцца педыкулёз — не гніды, дык вошы заядуць. Пагаравалі-пагаравалі людцы божыя і давай сягаць у пячорны ці каменны век.

Падаставалі з вышак жлукты, цэбры, бочкі, дзежкі і давай у іх плёхацца. А дзяды яшчэ і на печавых подыумах венікамі захрысціліся. Ды не той стандарт, не тая марка. У лазенцы куды лацвей: і зручней і чысцей. Дык хіба гэта жыццё без лазенькі?!

Свіслачане спрадвеку лічылі сябе цывілізаванымі людзьмі. Свіслач, калі не равесніца Эладзе, то стольнаму Кіеву паплечніца. У час станаўлення і росквіту Вялікага княства Літоўскага яна была важным апорным пунктам дзяржавы. Тут, над улоннем паўнаводных рэк Бярэзіны і Свіслачы на непрыступным крутагор'і горда высіўся магутны мураваны замак-крэпасць, у якой уладарылі намеснікі Вялікіх князёў, у тым ліку і славутага Гедыміна. Гедымінавічы рупна ставіліся не толькі да сваіх князёўнаў, але і да мясцовых прыгажунь. Таму і цяпер многія местачкоўцы лічаць сябе нашчадкамі княжацкага роду. І вось злы рок — з князёў у гразі. Якая жудасць! І ніхто не парупіцца — ні раённая, ні абласная ўлада. А аб сельвыканкаме і ўспамінаць не хочацца. Старшыня і голасу не падае. Вядома, чалавек наязджы, ды яшчэ па прозвішчы — Французаў. Такога ніколі не было, каб Свіслач заставалася без лазні.

На адным толькі замчышчы іх было аж тры. Пры нямецкай акупацыі іх было некалькі, усе працавалі бездакорна. Пасля вайны засталася адна, амаль спарахнелая. На падгор'і, насупраць такой жа нямоглай хаткі бабкі Кулінкі. І яе нашы "кацюшы" ў 44-м не пусцілі з дымам да Бога! Усё мястэчка з зямлёй спрасавалі, а лазеньку пашкадавалі. Яшчэ восем гадоў яна служыла верай і праўдай добрым людзям, пакуль не пабудавалі ўсім калгасам больш прыдатную, мураваную. А сённяшні калгас — гол як сакол: на салярку сродкаў нестае. Праўда, адны работнікі канторы жывуць бязбедна, а ўсе астатнія калгаснікі ледзь перабіваюцца з хлеба на квас. Затое беспрацоўных туляг, у асноўным перасяленцаў з чарнобыльскай зоны, процьма. У калгасе працаваць за мізер не жадаюць. Абкрадваюць мясцовы люд. Цягнуць усё, што дрэнна ляжыць, абы на бутэльку хапіла. І наша доблесная міліцыя ніякай рады даць не здолее. Хаця ёсць у Свіслачы яшчэ і рэспубліканскі дзіцячы санаторый. Дык там спецыялісты патрэбны — настаўнікі, выхавальнікі, урачы, інжынеры. А туляг і лайдакоў туды і на гарматны выстрал не падпускаюць.

Але ж мыцца патрэбна ўсім. Гадаў-кумекаў над гэтым сакраментальным пытаннем Міхась Краўчанка з вуліцы Бярэзінскай і зрабіў ход канём. Хаця конь у яго быў не зусім цягавіты, але пару вазоў сухастою і іншага ламачча за тыдзень мог прывалачы. Напілаваў Міхаська дроў, сарваў грозныя раённыя пломбы і зацепліў лазнечку. І пацягнуліся нямыцькі венічкамі дубасіцца, ды доку-Міхасіка хваліць і ўвішную ручку яго залаціць. А заадно і пламбірнікаў ушчуваць па ўсіх склонах, акрамя давальнага: лазня як лазня — усе яны брудныя, але людзі выходзяць з іх чыстымі. Праўда, не шкодзіла б яе падрамантаваць. Сцены капітальныя — на пяць стагоддзяў яшчэ хопіць, толькі б столь і падлогу замяніць ды керамічнай пліткай знутры аздобіць.

Але, як кажуць, нядоўга музыка грала. Жонка Краўчанкі Галіна-крамніца стала прыкмячаць, што міленькі і суджаны пасля лазневых шчыровак стаў прыходзіць нанач пад мухай, а то і п'яны ў дыміну. Тым часам і куры пачалі знікаць бясследна з падворку. Пляткаркі хутка засведчылі, што Міхаська скубе і смажыць бедных нясушак у прылазневай качарцы на закусь. Колькі таўкачоў і дзяркачоў паламала раз'юшаная някволая Галечка на спіне Міхасіка, аднаму Богу вядома. Занядужаў Міхасік і лазні цураўся. А местачкоўцы зноў асірацелі, зноў забедавалі нямыцькі.

Паплакалі, пагаравалі, нарэшце ўспомнілі пра састарэлага аднавяскоўца, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Івана Іванавіча Вярнікоўскага. Чалавек дасведчаны, пісьменны, у калгасе эканамістам працаваў, бункер фюрэра штурмаваў, на рэйхстагу подпіс свой пакінуў. А напісаць у вярхі пра лазневыя прыгоды яму і Бог нагадаў. Можа, тыдзень, можа, два карпеў Іван Іванавіч над допісам самому Прэзідэнту. Адшліфаваў, як мае быць. Але да агульнаабранага допіс так і не трапіў. Забуксаваў на самым падыходзе, у апартаментах прэзідэнцкага памагатага, начальніка ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян Букі, які і паведаміў, што "зварот накіраваны Магілёўскаму аблвыканкаму".

У Магілёве з шэдэўрам эпісталярнага майстэрства Івана Іванавіча наогул цырымоніцца не сталі, а па той жа тэхналогіі спіхатэхнікі сплавілі ў Асіповічы. Першы намеснік старшыні райвыканкама Пятроўскі свіслачанам адпасаваў даўно вядомую ім ісціну, што будынак грамадскай лазні для далейшай эксплуатацыі непрыгодны. А каб наогул не ашарашыць местачкоўцаў, па сакрэце паведаміў, што лазняў няма і ў суседніх аграгарадках "Ліпень" і "Краснае". Радуйцеся, нямыцькі, не адны вы такія.

Ад такога суцяшэння лягчэй не стала. Як бы мовіў Астап Бэндэр, "гэта не Рыо-дэ-Жанейра, гэта значна горш".

Паняцце "аграгарадок" хоць круць-верць, хоць верць-круць, ні ў якія свіслацкія вароты не лезе. У абліччы некалі былога райцэнтра толькі і змянілася, што на адным баку цэнтральнай вуліцы з'явіўся тратуар. Жыхары супрацьлеглага боку такой аздобы як бы не вартыя. Тым не менш раённыя кіроўцы ўжо адрапартавалі па вертыкалі, што вышэйзгаданыя гарадкі да эксплуатацыі гатовы.

Заганныя звычкі нашых чынных рапартоўцаў ужо даўно ўсім надакучылі. Не паспелі першы камень у падмурак закласці, а наверх ужо шлюць бадзёры рапарт — уваходзіны справілі. А ў сельсавеце з 37 вёсак (два тыя ж аграгарадкі "Свіслач" і "Краснае") ніводнай грамадскай лазні. Сам жа Васіль Сямёнавіч Пятроўскі толькі бухнуўся на калені перад сваімі магілёўскімі шэфамі з просьбай уключыць у план фінансавання на лазневыя патрэбы "арыенціровачна 600 мільёнаў рублёў".

"Дык хто ж іх дасць?" — ачомкаліся хутка ў райвыканкаме.

І ў Свіслач паляцела зусім іншая рэляцыя ўжо за подпісам кіроўцы крыху ніжэйшага рангу — намесніка старшыні І.А.Трацяка: "Калгас "Усход" на мехдвары пабудуе лазню да 1 жніўня".

"Ды гэта ж сапраўдны разбойніцкі свіст!" — у роспачы ўсклікнулі свіслацкія малавераы. І не памыліліся. Скончыўся жнівень 2006-га, а аб будоўлі ні слыху ні духу.

Тым часам лазневая нудота абрыдла і самому старшыні райвыканкама Шукаловічу. Пятро Яфімавіч уласна адрасаваў занепакоенаму І.І.Вярнікоўскаму і іншым усцешны ліст. У ім не было і намёку на прабачэнне. Гэта быў вялікадумны даследчы трактат, насычаны "аўтарытэтнай" статыстыкай. Склалася ўражанне, што першая асоба раёна даўно адвыкла ад роднай, простай, даходлівай мовы ва ягоду лапідарнай казёншчыне. "Згодна з дзяржаўным сацыяльным стандартам па абслугоўванні насельніцтва, наяўнасць памывачных месц у лазнях у жыллёвым нядобраўпарадкаваным фондзе складае на 1000 жыхароў 5 месц. У в.Свіслач пражывае 755 чалавек, на тэрыторыі вёскі знаходзіцца 30 прыватных лазень. Разам з тым на мехдвары СПК "Калгас "Усход" вядзецца будаўніцтва лазні на 10 памывачных месцаў. У цяперашні час вядуцца аддзелачныя работы".

"Дачакаліся Пятра, цяпер і сыру будзе ад пуза!" — усклікнулі збянтэжаныя чытальнікі. Якая лухта, якое бесперспектыўнае мысленне! У вясенне-асенні перыяд колькасць свіслачан узрастае утрая: студэнты, гараджане з дзецьмі і ўнукамі, уладальнікі леішчаў. Улады ратуюць за аграгарадкі, а вышэйшы раённы кіроўца абракае на феадальны нядобраўпарадкаваны жыллёвы фонд. І адкуль ён узяў 30 прыватных лазняў? Вядома, ад Французава. Трэць ці набярэцца.

А датычна лазні на мехдвары, няхай там са сваімі механізатарамі справяцца. Паспрабаваў, было, Іван Іванавіч са сваімі сябрамі па няшчасці Цімошчанкам і Галімулам палагодзіцца — лепш бы перцу з макам наглыталіся: у памывачнай каморцы утрох з шайкамі ледзьве памясціліся: а ў парылцы на траіх месца не хапіла.

"Ну і лоўка абуў у лапці Пятра Яфімавіча Міхась Пятровіч!" — пацяшаліся збітыя з панталыку апрабавальнікі. І як цяпер яны будуць перад людзьмі апраўдвацца наконт дзесяці памывачных месцаў? Канфуз ды і толькі! Ды і хто пойдзе з вяскоўцаў лазніца на гэтыя чортавы выселкі? У высокіх кабінетах толькі лацвей народ адпіскамі карміць.

Не, гэта не Рыо-дэ-Жанейра! Гаруйце, нямыцькі!

І.КАЗАК,
карэнны жыхар Свіслачы.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной воли" отвечает юрист ***Олег ВОЛЧЕК***

Торговать можно не везде

Я пенсионерка, имею приусадебный участок, с которого собираю большие урожаи. Излишки продаю возле магазина. На днях ко мне подошли работники милиции и предупредили, что, если еще раз меня увидят торгующей в этом месте, привлекут к ответственности. Я не понимаю, за что?

И.И.Гуд,
г.Слуцк.

В соответствии с действующим законодательством существует ответственность за торговлю в неустановленных местах. Согласно ст.148 Кодекса об административных правонарушениях, предусмотрен порядок привлечения и санкции за данное правонарушение. Так что, если в том месте, где вы осуществляете торговлю, официально не разрешено торговать собственной продукцией, то требования и предупреждения работников РОВД вполне правомерны.

Наниматель был обязан принять вас на работу

Недавно я вышел из мест лишения свободы. Стал на учет в Центре занятости населения. Через какое-то время мне выдали направление на трудоустройство на одно из предприятий города. Когда я пришел в отдел кадров и сказал, что недавно освободился, мне отказали в приеме на работу. Правомерно ли со мной поступили?

А.А.Митин,
г.Брест.

В соответствии с ч.1 ст.16 Трудового кодекса РБ, запрещается необоснованный отказ в заключении трудового договора с гражданами, направленными на работу государственной службой занятости в счет брони. Согласно Закону "О занятости населения Республики Беларусь", государство Вам гарантирует в счет брони трудоустройство, так как Вы освободились из мест лишения свободы, а поэтому отказ нанимателя является необоснованным и может быть обжалован Вами в суде. Одновременно можете написать жалобу прокурору района для внесения представления должностному лицу, отказавшему в заключении с Вами трудового договора.

За драку ответит

28 июля 2006 года около 21 часа я пришел к своей бывшей жене по месту ее жительства. В это время у нее находился ее гражданский муж. На почве сложившихся ранее неприязненных отношений с ним произошла драка. В ходе драки сожитель причинил мне телесные повреждения, которые, по заключению эксперта, относятся к категории легких, повлекших за собой кратковременное расстройство здоровья. Должен ли он нести уголовную ответственность за происшедшее?

С.Н.Молчан,
Минск.

Да, должен. Данная категория дел относится к делам частного обвинения, т.е. Вы должны обратиться в суд с заявлением о возбуждении уголовного дела в отношении сожителя Вашей бывшей супруги по статье 153 УК за умышленное причинение легких телесных повреждений, повлекших за собой кратковременное расстройство здоровья. В рамках уголовного дела Вы можете подать гражданский иск о возмещении морального вреда.

БОЛЬ

Чаго яны баяцца?

Шаноўная "Народная воля"!

Дасылаю верш "Из юности своей сорок второго" і прашу яго надрукаваць. Напісаў яго яшчэ да Дня абаронцаў Айчыны і аднёс у рэдакцыю Слаўгарадскай раённай газеты "Прысожскі край". Але, насуперак абяцанням, верш так і не быў надрукаваны.

Прычынай гэтага "ад варот павароту" з'явіўся, пэўна, зборнік маіх вершаў "Баліць, крычыць мая душа", выдадзены з фінансавай дапамогай сядзібы БНФ, аб якім Народны паэт Ніл Гілевіч сказаў: *"Вельмі людская атрымалася кніга, вельмі цэласная. Маналіт! Сапраўдная палітычная лірыка, надзвычай патрэбная ў такія часы, як наш".*

Прабачце за нясціпласць, што цытую такі аўтарытэтны водгук. Каму верыць — Народнаму паэту ці раённшчыкам?

Праўда, раней у той жа раёнцы мае вершы ішлі, а вось цяпер... Можа, няпраўду пішу, "лью грязь"?

Гэта ж трэба так баяцца ветэрана, які мае свой голас, а не падпявае лізаблюдам! Кепскія вашы справы, палахліўцы, бо не падобныя вы на тых, з кім я разам ішоў у бой...

Из юности своей сорок второго...

Из юности своей сорок второго
Пишу друзьям в две тысячи седьмом.
Осталось нас уже совсем немного,
Кто уцелел под вражеским огнем.

Я ваших адресов, увы, не знаю,
Но знаю, что письмо мое дойдет.
На полевую почту посылаю,
Вас письмоносец ротный наш найдет.

И вручит в руки вам мое посланье,
Всех разыскав во взводном блиндаже,
Куда вас возвратит воспоминанье
Об огневом переднем рубеже.

Переживете вновь и грохот артналета,
Всем телом втиснувшись в траншейный ход.
И, вспомнив, что вы — матушка-пехота,
Навстречу шквалу броситесь вперед...

Не всем из них сегодня обелиски
Стоят, не всех известны имена.
Без вести павших траурные списки
Хранит в архивах много лет страна.

А это значит — нет войне забвенья,
Пока не будет четкий дан ответ,
Что неизвестных нет захоронений
И неизвестных павших больше нет.

...Из юности своей сорок второго
Ищу друзей в две тысячи седьмом,
Надеясь втайне — чуточку, немного,
Что кто-нибудь откликнется письмом.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ,
інвалід Вялікай Айчыннай вайны.

г.Слаўгарад.

КАК ЭТО БЫЛО

«Катили бочки» на Швецию, а все обернулось чернобыльской тайной

Говорят, что с годами человек свыкается с неизбежным злом. Дескать, по причине людской короткой памяти. Между тем невольно начинаешь верить в это, когда видишь, как люди, покинувшие после чернобыльского взрыва полесские деревни, вновь обживают их, как засевают отборным зерном те самые поля, на которые обрушился радиоактивный смерч.

Что же случилось тогда, в ночь на 26 апреля 1986 года, на Чернобыльской АЭС? Сегодня ученые многих стран, в том числе и отечественные, утверждают: произошла техногенная катастрофа. Согласитесь, малопонятное для простых смертных объяснение. Видимо, осознав это, его авторы вскоре уточнили: силу взрыва на Чернобыльской АЭС можно приравнять к мощи нескольких сотен атомных бомб типа той, которую американцы 6 августа 1945 года сбросили на Хиросиму. Тогда, по оценке японских властей, погибла 71 тысяча человек, было ранено 68 тысяч, зона сплошных разрушений составила 5 квадратных километров. Такова японская статистика. А во что обернулась ядерная атака чернобыльского джинна на земли Беларуси, России и Украины?

"В результате аварии миллионы людей испытали шок от бедствия, которое с трудом осознавали и от которого не могли защититься", — отмечали главы государств — участников Содружества Независимых Государств в совместном Обращении к народам государств — участников СНГ и мировой общественности в связи с 20-й годовщиной аварии на Чернобыльской АЭС. Далее в документе говорилось, что "особую тревогу вызывает состояние здоровья как проживающих на пострадавших территориях, так и ликвидаторов аварии".

Короче, даже в честь юбилея были лишь общие слова и ничего конкретного. Конкретикой оперировал в своем интервью российскому телеканалу ТВЦ известный белорусский ученый академик Василий Нестеренко. Он сообщил, в частности, что в пострадавшей от чернобыльского взрыва Гомельской области более или менее нормальное здоровье лишь у 10% детей, а в Наровлянском районе этой же области вообще нет ни одного здорового ребенка. Таков взгляд независимого эксперта на последствия так называемой "технологической катастрофы".

"Чернобыль по-прежнему живет, и он продолжает убивать все живое", — утверждал в интервью тому же телеканалу ТВЦ первый комендант чернобыльской зоны Марат Бергман. Что это — эмоции, пережитое подвигли известного еще в советское время ликвидатора на такое заявление? Или он действительно что-то знает, о чем до сих пор предпочитают не распространяться власти пострадавших стран, в том числе и белорусские?

Любопытно, что первыми, кто попытался проникнуть в тайну "технологической катастрофы", были журналисты из Страны Суоми — участники состоявшегося в Киеве буквально через месяц после чернобыльского взрыва советско-финского журналистского семинара, посвященного теме правдивой информации как средства доверия между странами. На то время встречи подобного плана стали уже традиционными. Проводились они раз в два года — поочередно в Финляндии и СССР.

Почему очередную из них было решено провести именно в столице Украины да еще к тому же спустя месяц после аварии на Чернобыльской АЭС? Неужто советские хозяева семинара решили поделиться со своими финскими гостями некоей информацией о случившейся трагедии?

— Ну что вы, — скептически улыбнулся руководящий товарищ из Союза журналистов СССР, — мы сами ничего не ведаем...

Узнав, что в составе советской делегации автор этих строк представляет Союз журналистов БССР, поинтересовался:

— А что у вас, в Беларуси? Известно что-либо о Чернобыле?

Вопрос, что называется, повис в воздухе.

Мой собеседник не таил, что Кремль хотел перенести место встречи участников семинара. Но финская сторона настояла на прежней договоренности: только Киев! Аргументация была, как говорится, безотказная: вот уже 30 лет Киев — побратим известного финского города Тампере.

Москва в итоге махнула в ответ рукой, надеясь, что в побратимских застольях утонут неудобные для нее вопросы.

Только финские журналисты отнюдь не собирались тонуть.

— Мы ведь поначалу думали, что ядерный взрыв произошел на одной из шведских атомных электростанций, — рассказывал мой давний знакомый, заведующий отделом информации старейшей в Финляндии газеты "Turun Sanomat" ("Известия Турку") Эско Кяркяйнен. — И так как Советский Союз хранил молчание, то финны тут же, что называется, "покатили бочки" на соседнюю Швецию. Масла в огонь подлила европейская пресса. Так, например, итальянские газеты писали, что после 26 апреля "в Финляндии птицы на лету замертво падают на землю, а две тысячи граждан Страны Суоми стали жертвами лучевой болезни".

— Конечно, дело Советского Союза хранить молчание в связи с тем, что происходит на его территории, — заявил, выступая на семинаре в Киеве руководитель Союза журналистов Финляндии Антеро Лайне. По его мнению, такая позиция лишь бросает тень на советскую информационную службу. И далее он заметил: "Если советский журналист надеется, что во время той или иной пресс-конференции он получил от руководителей своей страны нужную информацию, то его коллега из Финляндии всегда сомневается в таких случаях по отношению к чиновникам финского государства".

"Информация в СССР на государственном уровне по-прежнему носит ограниченный характер, что отрицательно сказывается на публикуемых в стране газетных материалах", — сказал Антеро Лайне.

Другой финский "семинарист" Мауно Паасилинна, высказав восхищение мужеством ликвидаторов чернобыльской катастрофы, с грустью констатировал, что трагедия преподнесла всем честным журналистам горький урок: они по-прежнему не в состоянии закрыть каналы лжи.

— Ну что вы, господа, у нас все нормально! — воскликнет в день открытия семинара улыбающаяся мадам Шевченко, тогдашний председатель президиума Верховной Рады Украинской ССР и, окинув веселым взглядом журналистов, вопрошающе добавит: — Согласитесь, разве проводили бы мы первомайскую демонстрацию трудящихся в Киеве, если бы в городе была опасная радиационная обстановка?

Ссылка на первомайское шествие киевлян не убедила финских гостей: почти у каждого из них были дозиметры. Да и меня, неоднократно бывавшего в Киеве, на сей раз удивляло полное отсутствие детей на улицах украинской столицы, а еще безлюдье на золотистых днепровских пляжах, хотя над городом стояла удручающая жара — как потом выяснится, сказывалось влияние чернобыльской радиации.

Финские коллеги не скрывали своего недоумения: как можно было в такой тревожной ситуации выводить людей на улицы 1 Мая? Опять же — вопрос остался без ответа.

В какой-то степени удовлетворить любопытство финских журналистов попытался тогдашний глава киевской администрации Иван Плющ. "Да, — сказал он, — мы только через неделю начали эвакуацию людей из зараженной зоны. Сколько вывезли? 90 тысяч человек, а еще 40 тысяч голов крупного рогатого скота. Жители пострадавших районов волнуются: когда они смогут вернуться домой? Хотелось бы их обнадежить, что скоро. Но не получается, потому как местные власти сами не знают, что же, в конце концов, произошло на Чернобыльской АЭС 26 апреля".

— Одним словом, как говорят у вас, — тайна за семью печатями, — резюмировал по-русски голос из зала. А принадлежал он не советскому журналисту, а корреспонденту самой читаемой в Финляндии газеты "Helsingin Sanomat" ("Известия Хельсинки") Мартти Валконену. Через день он станет автором сенсационной находки, когда, листая в библиотеке республиканского Дворца профсоюзов, где проходил семинар, подшивку газеты "Литературная Украина", он наткнулся на критическую статью, посвященную строительству Чернобыльской АЭС. В чем была суть критики? На стройке процветало массовое воровство строительных материалов, в том числе — цемента. Его нехватку в растворе бетонщики компенсировали лишней дозой песка. Можно себе только представить, какого качества бетон был задействован на печально знаменитой сегодня Чернобыльской АЭС, и понять, почему спустя годы он не выдержал натиска ядерного джинна...

Александр КИЙРАНЕН.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Усё па плане

У мінулым нумары "Народная воля" паведаміла, што ў Мінску з 10 мая пачынаецца адключэнне гарачай вады. Але вы не напісалі, колькі мы будзем заставацца без вады — месяц, як раней, альбо два тыдні, як у апошнія гады? Кажуць, што з-за неабходнасці эканоміць паліва адсутнасць вады будзе доўгай...

С.П.Кротава, г.Мінск.

Як запэўнівае прадпрыемства "Мінскія цеплавыя сеткі", прафілактычныя работы на цеплавых сетках будуць максімальна скарочаны. Тэрмін адключэння гарачай вады не будзе перавышаць 14 дзён, але толькі ў тым выпадку, калі не спатрэбіцца нейкі незапланаваны рамонт.

Алег СНОЎ.

ФАКТ

Са 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Чарнобыльскую зону пажадалі наведаць толькі 8

Пра гэта паведаміў дэпутат Мікалай Куцко падчас парламенцкіх слуханняў "Чарнобыль: дваццаць гадоў пасля".

"У Палаце 110 чалавек, для паездкі ў чарнобыльскія раёны замовілі аўтобус на пяцьдзесят месцаў. А паехалі туды толькі восем дэпутатаў", — паведаміў Мікалай Куцко.

Дарэчы, падчас слуханняў высветлілася, што не так усё добра ў Беларусі з прадуктамі харчавання, як некаму падаецца. Так, Расійская Федэрацыя мае прэтэнзіі да якасці беларускай ялавічыны. У прыватнасці, расійскія эксперты занепакоены павышанай доляй стронцыю ў костках жывёлы. Пра гэта паведаміў старшыня чарнобыльскай камісіі Віталь Кулік. Інфармацыю пацвердзіў і віцэ-прэм'ер Аляксандр Косінец.

У Беларусі наогул няма нормы на стронцый-90 у костках жывёлы. Можа, таму нам і здаецца, што прадукцыя "чыстая"?

Ала СКОРЫК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

У СОСЕДЕЙ

Почему Виктор Ющенко перенес выборы на 24 июня?

Президент Украины Виктор Ющенко подписал указ о назначении внеочередных парламентских выборов на 24 июня 2007 года. "Я подписываю указ ради демократического политического решения проблем в жизни страны, и, руководствуясь статьей пятой Конституции Украины, я подписываю указ о назначении внеочередных выборов Верховной Рады Украины на 24 июня 2007 года", — заявил Ющенко.

Он пояснил, что сейчас у него есть правовые основания для такого решения, поскольку истек месяц со дня неконституционного формирования коалиции. "Прошел уже месяц с тех пор, как в Верховной Раде переформатирована коалиция вопреки Конституции, и теперь президент Украины в полной мере может реализовать свое право распустить парламент на основании статьи 90 Конституции Украины", — заявил Ющенко.

"Я убежден в юридической правоте и политической необходимости такого решения, убежден что это решение понимает украинское общество и понимают ответственные украинские политики", — сказал Ющенко.

Он пообещал, что выборы будут демократическими и честными. Президент пояснил, что выборы невозможно подготовить к назначенной на май дате. Это, по его словам, подтверждает заявление Центральной избирательной комиссии, в которой нет кворума для принятия решений, а также определение Высшего административного суда от 24 апреля.

Ющенко сказал, что выразил премьер-министру Виктору Януковичу свою обеспокоенность тем, что Кабинет министров не начал финансирования досрочных выборов, как это предусмотрено указом.

"Это действия, которые граничат с нарушениями уголовного закона", — сказал Ющенко.

Ранее президент Украины, подписавший 2 апреля указ о роспуске Верховной Рады и назначении досрочных выборов на 27 мая, признал, что проведение выборов придется отложить. Премьер-министр Украины Виктор Янукович убежден, что после политического кризиса Украина станет более демократическим государством, независимо от результатов переговоров между сторонами конфликта, сообщил Корреспондент.net.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ:

«Барыс Ельцын быў больш дэмакратычным прэзідэнтам, чым яго пераемнік...»

Экс-старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання Станіслаў ШУШКЕВІЧ шкадуе, што не змог, як планавалася раней, сустрэцца ў мінулым годзе з Барысам Мікалаевічам Ельцыным. Станіслаў Шушкевіч вельмі добра ведаў першага прэзідэнта Расіі...

— Станіслаў Станіслававіч, сёння Вы памятаеце, калі ўпершыню пазнаёміліся з Барысам Мікалаевічам Ельцыным?

— Першае знаёмства ў нас адбылося на Дзяржсавеце ў 1991 годзе, восенню. Гэта было такое блізкае знаёмства. Але да гэтага мы сустракаліся ў міжрэгіянальнай групе на з'ездзе народных дэпутатаў СССР у 1989 годзе. Я не памятаю такіх асаблівых дэталяў таго знаёмства, таму што сустрэчы праходзілі ў прысутнасці шматлікіх людзей і былі ў рамках рабочых сустрэч. Аднак, паўтаруся, больш блізкае знаёмства з Барысам Ельцыным адбылося ў 1991 годзе.

— Больш блізкае — гэта як?

— Гэта азначае, што мы размаўлялі адзін на адзін, сустрэча праходзіла падчас пасяджэння Дзяржсавета. Міхаіл Гарбачоў вёў тады Дзяржсавет, у перапынку звычайна дамаўляліся паміж сабой кіраўнікі рэспублік былога Саюза. З Ельцыным мы тады гутарылі аб праблемах энерганосьбітаў для Беларусі. Дарэчы, тая гутарка, напэўна, і была тым самым штуршком для перамоў у Белавежскай пушчы.

— І якое засталося першае ўражанне ад сустрэчы?

— Толькі добрае, таму што Ельцын, мне падавалася, быў больш адкрытым чалавекам, чым іншыя палітыкі і менш партыйным функцыянерам, чым астатнія савецкія партыйцы. Барыс Ельцын, напрыклад, ніколі не мог дазволіць сабе лаяцца матам, у адрозненне ад астатніх партыйных дзеячаў тых часоў. З ім было лёгка размаўляць і можна было хутка зразумець — альбо мы вырашаем пытанне, альбо не.

— А як Ельцын у той час адносіўся да Беларусі?

Барыс Ельцын выступае ў Вярхоўным Савеце Беларусі 12-га склікання.

— А ён да ўсіх краін адносіўся добра, тым больш у размовах. Не скажу, што да Беларусі быў нейкі суперінтарэс з яго боку, аднак ён заўсёды цікавіўся нашымі справамі.

— Станіслаў Станіслававіч, а ці маглі Вы з Ельцыным, скажам так, пасядзець, выпіць, што называецца, па чарцы?

— Гэта было, чаго хаваць. Ва ўсялякім выпадку пасля самітаў СНД арганізоўваліся невялікія застоллі, мелася магчымасць выпіць і пасля пасяджэнняў Дзяржаветаў. Аднак, скажу Вам шчыра, ніколі гэта не пераходзіла межаў і ніколі не пераўтваралася ў асаблівае захапленне. Не больш чаркі. Хоць ведаю, што пра Барыса Ельцына хадзіла нямала чутак аб яго вясёлым характары.

— І асабліва пра Віскулі, калі падпісвалася Белавежскае пагадненне...

— Я паўтараў і яшчэ раз паўтараю, што, нягледзячы на ўсе плёткі, што мы там увесь час пілі, гэтага не было і блізка. Усё праходзіла вельмі і вельмі стрымана, ніякіх сола і ніякіх уладных выказванняў.

— Паміж Вамі і Ельцыным здараліся канфлікты?

— Нельга назваць гэта канфліктам.... Проста перад Віскулямі была невялікая пагроза зрыву сустрэчы, таму што Ягор Гайдар, да якога я адношуся з вялікай павагай і якога вельмі паважаў Ельцын, імкнуўся інтэнсіфікаваць рыначныя пераўтварэнні. Інакш кажучы, адкрытым тэкстам ён не заяўляў, што за газ і нафту Беларусі патрэбна будзе плаціць, аднак гэта мелася на ўвазе. І падчас сустрэчы ў Віскулях у нас быў намер дамовіцца аб тым, што мы будзем прытрымлівацца рыначных пераўтварэнняў да таго часу, пакуль не ўстанем на ногі. Па вялікім рахунку, мы гэтага дасягнулі.

— Барыс Ельцын пакінуў пасля сябе пераемніка — Уладзіміра Пуціна. Вы лічыце, што гэта яго ўласны выбар?

— Зразумела, што супраць свайго жадання Барыс Ельцын не мог бы гэтага зрабіць. Але тое, што пераемнік праз нейкі час падвёў яго па многіх накірунках — гэта адназначна.

— Падвёў?..

— Так! Паглядзіце, гэтая кандыдатура па сутнасці ліквідавала мясцовае самакіраванне і пачала будаўніцтва піраміды ў Расіі. Гэтая кандыдатура зацвердзіла камуністычны гімн Расіі, супраць чаго заўсёды выступаў Ельцын. Уладзімір Пуцін аказаўся не такім дэмакратычным, якім быў Барыс Ельцын. Хоць я не скажу, што Пуцін нейкі там "чалавек з вуліцы" — у школе КДБ на самай справе давалі цудоўную адукацыю і веды, гэта ж ні для каго не сакрэт.

— Станіслаў Станіслававіч, у апошні час з Барысам Мікалаевічам Вы не сустракаліся?

— На жаль, не. Хоць сустрэча тых, хто ў свой час быў у Віскулях, прызначалася два разы. Першы раз гэта было на дзесяцігоддзе падпісання Белавежскага пагаднення, я і Краўчук ужо прыехалі ў Маскву, зайшлі да Генадзя Бурбуліса, адкуль і збіраліся адправіцца да Барыса Ельцына ў Барвіху. І тут даведваемся, што ў гэты час Уладзімір Пуцін уручае Ельцыну ордэн. Другі раз, год назад, хацелі сустрэцца ў Беларусі, Барыс Мікалаевіч збіраўся прыехаць у Віскулі таксама. Яго тады мы так і не дачакаліся, здароўе было ўжо не тое. Вельмі шкада...

Алесь СІВЫ.

ЛЮБОПЫТНО

«Пивная нация»

Австрия стабильно занимает третье место в мире по потреблению пива после Чехии и Германии.

На душу населения Альпийской республики приходится в год 108,9 литра ячменного напитка, сообщил союз австрийских пивоварен. Ежегодно в стране выпиваются девять миллионов гектолитров пива.

Как "пивная нация" Австрия удерживает в Евросоюзе первенство по количеству пивоварен — одна на 56.860 человек. Всего в стране действуют 146 предприятий по производству этого напитка, включая 91 "домашнюю" пивоварню. Они производят более 600 сортов пива.

«Билк»

На прилавках магазинов японского города Накасибэцу (остров Хоккайдо) появился необычный напиток — пиво, сделанное на основе обычного коровьего молока.

Идея использовать молоко в таком качестве пришла в голову одному местному фермеру после того, как ему пришлось избавиться от большого количества молока из-за перепроизводства и невозможности сбыта. Фермер предложил свою идею одной пивоваренной компании, которая разработала технологию производства.

В подогретое молоко добавляют пивные дрожжи и хмель, после чего выдерживают какое-то время. Когда начинается процесс ферментации, жидкость цветом и запахом начинает напоминать чай с молоком. После остывания цвет меняется, и напиток уже выглядит, как обычное фильтрованное пиво. Изготовитель утверждает, что новый продукт обладает фруктовым привкусом и необычным послевкусием.

"Молочное" пиво назвали "Билк", соединив английские слова beer (пиво) и milk (молоко). Новый напиток будут продавать в небольших бутылочках объемом 0,33 литра.

«Вилять хвостом»

Владелец зоомагазина в городе Цельхем на юге Нидерландов Терри Беренден изобрела пиво для собак, сообщило агентство "Ассошиэйтед Пресс".

Идея пришла к Терри Беренден однажды после охоты с друзьями. Свой безалкогольный напиток, сделанный из говяжьего экстракта и солода, она назвала Kwispel, что в переводе с голландского означает "вилять хвостом".

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

«Global Luxury Forum» в Лондоне

В Лондоне прошел "Global Luxury Forum" — мероприятие, в котором участвовали компании — мировые лидеры международного рынка товаров и услуг класса "премиум". Впервые за всю историю бизнес-конференций супермодель Наталья Водянова выступила в качестве докладчика.

Топ-модель стала почетным гостем Форума вместе со своим супругом лордом Джастином Портманом. Завершение Global Luxury Forum символизировала вечеринка Moscow Motion, ставшая одновременно открытием светских мероприятий 10-го Российского экономического форума. Как утверждают организаторы, основная идея Moscow Motion — презентовать молодую, современную и динамичную Россию вниманию западного сообщества. Второй год подряд местом проведения Moscow Motion была выбрана одна из необычных и стильных площадок столицы Великобритании — Олд Биллингсгейт Маркет с удивительным видом на Темзу и Тауэрский мост.

Гостям обещали уникальную программу вечера: среди гостей —молодой британский исполнитель Mika, британская певица Софи Эллис-Бекстор. С российской стороны гостей развлекали группы "Виа-Гра", "Ногу Свело" и певец Сергей Лазарев. Легкие закуски были оформлены в оригинальном виде — гипсовые лебеди, наполненные чипсами, пирамиды из перьев с воткнутыми в них шпажками с сыром или шоколадными конфетами. Гости на вечеринку собрались самые разнообразные: бизнесмены, журналисты, деятели российского и британского шоу-бизнеса. Партнером вечера стала компания Hennessy, предложившая гостям оригинальные напитки.

ФРАНЦИЯ

Кто — Руаяль или Саркози?

Кто станет президентом Франции — Сеголен Руаяль или Николя Саркози? Это станет известно 6 мая, когда состоится второй тур президентских выборов. Идя навстречу пожеланиям читателей, расказываем о кандидатах.

Сеголен РУАЯЛЬ родилась в 1953 году в офицерской семье. Закончила экономический факультет Университета в Нанси, а также Институт политических наук в Париже. Работала судьей в Административном суде в Париже.

Сеголен Руаяль занимала посты министра окружающей среды (1992—1993 годы), заместителя министра образования по вопросам школьного образования (1997—2000 годы), заместителя министра труда и солидарности по вопросам семьи и детства (2000—2001 годы, а также 2001—2002 годы). В 2004 году была избрана главой западнофранцузского региона Пуату-Шарант.

Она мать четырех детей. Живет в гражданском браке с лидером Социалистической партии Франции Франсуа Олландом.

Лидер правящей консервативной партии "Союз народного движения", бывший министр внутренних дел Франции **Николя САРКОЗИ** родился в Париже в 1955 году. Образование получил в частной католической школе. В 1978 году закончил Институт политических наук в Париже, где изучал государственное право и политологию, а также прослушал курс частного права.

После учебы Николя Саркози начал работать адвокатом, специализирующимся на французском коммерческом праве, а именно — на праве в области недвижимости.

С 19 лет в политике. Именно в этом возрасте он вступил в партию "Союз демократов за республику". В 22 года стал членом городского совета в родном городке Нейи-сюр-Сен, который находится в пригороде Парижа. В 28 лет Саркози был избран мэром города.

Возглавлял молодежный комитет по поддержке Жака Ширака на президентских выборах в 1981 году.

В период с 1993-го по 1995 год занимал пост министра по бюджету и пост официального представителя правительства. В 2002-2004 годах был назначен министром внутренних дел. В 2004 году Саркози был избран председателем партии "Союз народного движения". Саркози оставил министерский пост и сосредоточился на партийной работе.

В результате отставки Кабинета министров в мае 2005 года из-за неудачного голосования по Европейской конституции Саркози был приглашен в новое правительство Доминика де Вильпена, в котором он занял пост министра внутренних дел Франции.

Андрей ПЕТРОВ.

Еще один банк-гигант

Приобретя своего конкурента из Нидерландов, британский банк Barclays становится вторым по величине в Европе

В европейском банковском секторе произошла кардинальная перегруппировка сил. Британский банк Barclays за астрономическую сумму в 67 миллиардов евро покупает своего нидерландского конкурента ABN Amro и становится вторым по величине кредитно-финансовым институтом в Европе и пятым в мире.

Это — крупнейшее поглощение в истории отрасли. ABN Amro является ведущим банком Голландии, история которого восходит к началу XIX века. Barclays в свою очередь был создан в конце XVII века и до сих пор занимал третью строчку в списке крупнейших кредитно-финансовых институтов Англии. Теперь он поднимется на второе место после HSBC, который одновременно является и британским, и европейским лидером.

Новый объединенный банк будет тоже называться Barclays и останется британским юридическим лицом, однако в качестве уступки голландской стороне штаб-квартира нового гиганта переедет из Лондона в Амстердам.

Как стало известно, в борьбе за крупнейший голландский банк ABN Amro неожиданно начался новый раунд: консорциум из трех европейских кредитно-финансовых институтов предложил за его акции на 13 процентов больше, чем готов заплатить британский банк Barclays.

Не исключено, что в этой ситуации последнему придется улучшить свое собственное предложение. Так что от начавшейся схватки наверняка выиграют акционеры голландского банка.

ЧТО НОВОГО?

Toyota стала лидером мирового авторынка

Автогигант Toyota впервые обошел по масштабам мировых продаж своего главного конкурента — американскую корпорацию General Motors, сообщил представитель японской компании.

Согласно опубликованным ею данным, за первые три месяца 2007 года по всему миру было продано 2 млн 348 тыс. автомобилей марки Toyota, в то время как GM реализовала на 88 тыс. единиц продукции меньше.

Японский автопроизводитель взял курс на резкое увеличение объема зарубежных продаж и добился значительных успехов на американском рынке — главном потребителе автомобилей в мире.

Это стало возможным благодаря популярности машин с низким расходом топлива, в частности, таких моделей, как Corolla, Camry и экологически более чистый Prius, оснащенный гибридным газово-электрическим двигателем.

В то время как Toyota, занимающая в США третье место, поставила целью обогнать опережающую ее компанию Ford, лидер американского рынка General Motors урезает производство из-за растущих цен на бензин. В прошлом году GM была вынуждена закрыть несколько заводов и сократить тысячи рабочих мест.

Toyota в свою очередь объявила о планах построить к 2010 году шесть новых заводов в разных странах мира, в том числе в России.

Между тем руководство General Motors утверждает, что показатели мировых продаж за первый квартал года могут не отражать реального положения вещей, и рассчитывает опередить японского конкурента к концу года.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

АБИТУРИЕНТ-2007

Все хотят быть руководителями, в крайнем случае — врачами и юристами

Самые востребованные специальности у абитуриентов-2007 — правоведение, лечебное дело и государственное управление. Об этом сообщил корреспонденту БЕЛТА директор Республиканского института контроля знаний (РИКЗ) Министерства образования Беларуси Николай Феськов.

По данным на апрель, около 80 тыс. выпускников нынешнего учебного года собираются поступать в вузы Беларуси. Специалисты РИКЗ при поддержке областных исполнительных комитетов и Минского городского комитета по образованию, средних общеобразовательных учебных заведений подготовили своеобразный перечень востребованности вузов и специальностей у учащихся 11-х и 12-х (экспериментальных) классов.

В пятерку самых востребованных, на взгляд абитуриентов, вузов вошли Академия МВД Беларуси, БГМУ, Академия управления при президенте Республики Беларусь, БГУ, БГЭУ и БНТУ.

Кроме названных выше специальностей будущих студентов привлекают также "Математика (научно-педагогическая деятельность)", "Экономика и управление на предприятии", "Гидропневмосистемы мобильных и технологических машин", "Прикладная математика", "Искусствоведение (музыковедение)", "Управление подразделениями мотострелковых войск", "Техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства", "Экономическая кибернетика", "Web-программирование и интернет-технологии" и другие.

По словам директора, подготовлен также перечень тех вузов и специальностей, куда желает поступать наименьшее число опрошенных выпускников. В эту двадцатку вошли Брестский госуниверситет имени А.С.Пушкина (специальность "Русский язык и литература"), Барановичский государственный университет ("Техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства"), Белорусская государственная сельхозакадемия ("Луговодство" и "Свиноводство"), БГУ культуры и искусств ("Литературная работа — драматургия", "Народное творчество"), БНТУ ("Водохозяйственное строительство") и другие.

Николай Феськов отметил, что перед специалистами стояла задача узнать только мнение учащихся 11-х и 12-х (экспериментальных) классов. Однако следует помнить, что свои знания захотят проверить и некоторые выпускники прошлых лет, поэтому приоритеты при выборе вузов и специальностей могут сместиться.

СТАЛІЦА

Не такія ўжо і майстры

Мінскія ўлады не ў сілах супрацьстаяць масавому неабгрунтаванаму выкарыстанню цырульнікамі званняў майстроў міжнароднага класа, прызнаўся журналістам начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама **Аляксандр КОЎШАР**. *"Мы спрабавалі праз Асацыяцыю цырульнікаў, стылістаў і касметолагаў паўплываць на сітуацыю, але марна,* — сказаў ён. — *Сёння, калі адменена ліцэнзаванне адукацыйных цэнтраў, і курсы адкрывае, хто хоча і як хоча, гэта зрабіць практычна немагчыма".*

Аляксандр Коўшар падкрэсліў, што людзі, якія прысвойваюць сабе ў газетных аб'явах і іншых анонсах статус майстра сусветнага ўзроўню, "ніякага права на гэта не маюць". Такое права, патлумачыў ён, можа мець толькі пераможца або прызёр міжнародных конкурсаў. Нават удзел у спаборніцтвах не дазваляе выкарыстоўваць гэты тытул. Больш таго, калі майстар увайшоў у дзесятку лепшых у Беларусі, ён таксама яшчэ не можа называцца майстрам міжнароднага класа, падкрэсліў прадстаўнік Мінгарвыканкама.

Пры гэтым ён раскрытыкаваў якасць работы шматлікіх цэнтраў цырульніцкага майстэрства: "Чаму можна навучыць за паўтара месяца курсаў? Выпускаюць скараспелак, якія потым нідзе не запатрабаваныя".

Паводле інфармацыі кіраўніка ўпраўлення, сапраўдныя майстры цырульніцкай справы сёння ў салонах не працуюць: яны ідуць "у цень", практыкуючы дома.

Алена НАВАЖЫЛАВА.

Озеро... «на ремонте»

В нынешнем сезоне озерный комплекс Центрального ботанического сада будет закрыт для посещений.

Как рассказал корреспонденту агентства "Минск-Новости" заместитель директора по научной работе Ботанического сада, кандидат биологических наук **Иван ВОЛОДЬКО**, реконструкция озера скорее всего продлится до конца текущего года. Необходимость такой работы назрела уже давно, ведь с момента основания в 60-х годах прошлого столетия озеро не чистили. По словам Ивана Володько, чистка донных отложений началась еще зимой. Это довольно долгий процесс. Кроме того, предстоит укрепить берега, облагородить прилегающую территорию. Ну а пернатым обитателям озера придется поискать себе новое место жительства. Так, по словам собеседника, утки, гнездившиеся на озере, переселились на другие городские водоемы. А лебедей, которые перезимовали в хозяйственных помещениях Ботанического сада, скорее всего передадут на время в Минский зоопарк.

ПРАБЛЕМА!

Валерый МАЗЫНСКІ:

«Сённяшні беларускі тэатр нагадвае мне страуса, які на два метры засунуў галаву ў пясок, каб не бачыць, што адбываецца навокал...»

Чаму ў беларускіх тэатрах амаль не ставяць п'есы беларускіх драматургаў?

За адсутнасць нацыянальнай драматургіі варта пазбаўляць працы?

Лічыцца, што ў кожным дзяржаўным тэатры працэнт сучаснай нацыянальнай драматургіі павінен складаць не менш за трэцюю частку ад асноўнай масы пастановак. Столькі ж месца павінна займаць у тэатральным рэпертуары нацыянальная і сусветная класіка. Астатняе — поле для эксперыментаў і наватарства.

Старшыня Саюза тэатральных дзеячаў, драматург і мастацкі кіраўнік Тэатра беларускай арміі **Аляксей Дудараў** лічыць такія патрабаванні абсалютна нармальнымі.

"У любой цывілізаванай краіне, калі дзяржава выдзяляе сродкі на ўтрыманне тэатра, яна патрабуе, каб абавязкова былі гэтыя 30 працэнтаў нацыянальных аўтараў, — гаворыць Дудараў. — *І менавіта сучасных аўтараў. У нас жа гэта не заўсёды вытрымліваецца. Скажу шчыра: многія беларускія тэатры ў сваім рэпертуары выкарыстоўваюць беларускую драматургію толькі ў якасці дэкарацый. І складаецца ўражанне, нібы драматургія развіваецца. А на самай справе ўсё робіцца толькі для галачкі, пасля таго, як начальства "наедзе" або каб не "наехала". Ніякага творчага пошуку, сучасных трактовак няма. Таму я і лічу, што сёння павінен быць больш строгі нагляд за станам нашага тэатра. Такі нагляд, які быў у старыя добрыя савецкія часы, калі за адсутнасць нацыянальнай драматургіі можна было проста пазбавіцца працы".*

Аднак жа нават гэтага мінімуму прытрымліваюцца не ўсе беларускія тэатры.

Так, **Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі**, якому па статусе належыць мець усе 80 працэнтаў беларускай драматургіі, з 16 прапанаваных гледачам спектакляў у сакавіку-красавіку, "абыграў" толькі 7 беларускіх аўтараў.

Мастацкі кіраўнік Тэатра беларускай драматургіі **Валерый Анісенка** кажа, што *"ў мастацтве, як і ў каханні, няма месца для працэнтаў".*

"Другая справа, што нацыянальная драматургія і наогул нацыянальны тэатр павінны мець нейкі прыярытэт і заахвочванне, — выказвае свае думкі Анісенка. — *Я лічу, што прапаганда беларускай драматургіі можа ажыццяўляцца ў тым ліку і ў выглядзе даплаты тэатрам за пастаноўку нацыянальнай драматургіі. Так, у нашым тэатры што і як ставіць вырашаю я. Але, с другога боку, Міністэрства культуры выпускае нам планавыя заданні. І нягледзячы на наша асабліва становішча як тэатра-лабараторыі беларускай драматургіі, нам дыктуюць планы па пастаноўкам, гледачам, даходам. Для нас гэта вялікая праблема... А што тут гаварыць, калі тэатр, "дзякуючы" плану платных паслуг, прыраўноўваецца к цырульням, каткам?.."*

У **Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы** сітуацыя лепш, чым у Тэатры беларускай драматургіі, але ў афішы твораў беларускіх драматургаў — маладых ды сучасных — усё ж такі няшмат.

А ў **Беларускім дзяржаўным музычным тэатры** мюзіклы і аперэты ад "айчыннага вытворцы" наогул з'яўляюцца рэдкімі гасцямі.

Аляксей Дудараў кажа, што ўсярэднены працэнт беларускай драматургіі на беларускай сцэне, які на сёння складае прыкладна палову, гэта не так ужо і мала.

"Нават калі было б і 40 працэнтаў, таксама было б добра, — гаворыць Дудараў. — *Таму што сапраўдная драматургія была, ёсць і заўсёды будзе справай складанай, а таму дэфіцытнай. Сапраўдная — гэта тая драматургія, якая пры сваёй высокай якасці будзе сучаснай, здольнай "класціся" на гледача — гэта значыць спектакль павінен настолькі закрануць душу, што ты ўжо не звяртаеш увагі на нацыянальнасць аўтара, на тое, хто рэжысёр і якія акцёры выступаюць на сцэне".*

Мы шукаем таленты?

Маладыя драматургі апынуліся ў складаным становішчы. З аднаго боку, адусюль чуюцца шкадаванні, што маладыя і творчыя сучаснікі не пішуць, а калі робяць гэта, то не нясуць матэрыялы ў тэатры. З другога — тэатры скардзяцца, што перагружаны стосамі няякасных твораў. Так, загадчыца літаратурнай часткай Купалаўскага тэатра **Лавінія Арэшка** прызнаецца, што праблема маладых беларускіх аўтараў насамрэч існуе: *"Калі меркаваць па нашым тэатры, то можна сказаць, што сёння няма бясконцага патоку п'ес сучасных беларускіх аўтараў. Яны цякуць да нас зусім тонкім ручайком. І з таго, што даходзіць, далёка не ўсё заслугоўвае ўвагі нават для таго, каб быць прачытаным. Таму я лічу, што галоўнае — п'еса павінна быць добрай і якаснай, беларуская яна ці не".*

Штосьці ў кантэксце недахопу маладых таленавітых сучаснікаў ужо робіцца. Вось ужо які год існуе арганізаваны Міністэрствам культуры конкурс, у рамках якога маладыя рэжысёры робяць эсплікацыі (пісьмовы план пастаноўкі спектакляў) розных, у тым ліку і беларускіх, драматургаў. Пераможца конкурсу атрымлівае "пуцёўку" ў дзяржаўны тэатр.



Лавінія Арэшка прапануе пайсці далей: *"Мабыць, трэба арганізаваць яшчэ адзін конкурс менавіта для інсцэніравання беларускіх аўтараў. А мабыць, зрабіць і яшчэ адзін, дзе б ставіліся п'есы толькі сучасных драматургаў. Але, як я ўжо гаварыла, у нас няшмат маладых аўтараў. Мабыць, таму, што маладыя не пішуць чагосьці вельмі яркага, складаецца ўражанне застою. І з гэтай жа прычыны ставіцца класіка — тое, што заведама добра, з чаго дакладна можна зрабіць цукерку. Так, на нашых беларускіх спектаклях — "Смак яблыка" Дзялендзіка, "Чорная панна Нясвіжа" і "Вечар" Дударава, "Сымон-музыка" Янкі Купалы — - заўсёды аншлагі.*

Але кожнага розныя рэчы прымушаюць пайсці на спектакль. Многае залежыць ад таго, на якім узроўні знаходзіцца тэатральная культура чалавека. Так, хтосьці будзе хадзіць на абсалютна ўсе пастаноўкі з любімым акцёрам, нягледзячы на тое, што гэта за спектакль. А хтосьці наведае Акадэмію мастацтваў, дзе акцёры яшчэ не знакамітыя, але ж яму будзе цікавы аўтар ці рэжысёр".

Трэба чуць вуліцу

А вось мастацкі кіраўнік ліквідаванага тэатра "Вольная сцэна" **Валерый Мазынскі** не згодны з пазіцыяй **Лавініі Арэшка.**

"Калі Купалаўскі тэатр наогул так ужо строга выбірае, што з драматургіі чытаць, а што не, то ён павінен быць акадэмічным ва ўсіх сэнсах, — гаворыць Валерый Яўгенавіч. — Гэта значыць, што ніякіх "Таполевых завеяў" не павінна быць у такім тэатры, і акцёры павінны быць не менш за метр восемдзесят ростам. Калі гэта класічны тэатр, то там павінен быць збор і драматургаў, і рэжысёраў, і акцёраў найвышэйшай пробы. Вось калі будзе так, тады я змагу зразумець, што яны не могуць "апусціцца" да супрацоўніцтва з маладымі і "неапрацаванымі". Але ж на тое ў іх ёсць Малая сцэна. Там можна і паэксперыментаваць. Але ж хто ў іх эксперыменце?..

І наогул для мяне сённяшні беларускі тэатр мёртвы. Ён нагадвае мне страуса, які на два метры засунуў галаву ў пясок, каб не бачыць, што адбываецца навокал. Тым больш што змест большасці тэатральных пастановак — забаўляльны. На мой погляд, сучасны беларускі тэатр не адчувае вуліцы, жыцця, ён жыве нейкім сваім жыццём. Здаецца, што ў ім пануюць 70—80-я гады мінулага стагоддзя. Не можа быць ніякай працы, калі ты не выходзіш на вуліцу і не адгукаешся на тое, што там робіцца. А сёння на вуліцы столькі прасвету, столькі моладзі, якая абнадзейвае, — гэта не тое, што было 30 гадоў таму!

Сучасная беларуская драматургія існуе, але якая — вось у чым пытанне. Хто і што піша для тэатраў?.. Пасля першых пяці хвілін спектакля я магу зразумець, якім будзе фінал і як ён будзе зроблены. І ўжо хочацца ісці дадому, але ж трэба дасядзець хоць да антракту, бо людзі побач. Калі адсутнічае драматургія, павінна прысутнічаць рэжысура. Прычым рэжысура аўтарская, якой няма ў нас. Таксама, як і маладой рэжысуры. Калі ёсць маладая драматургія, павінна быць і маладая рэжысура. Таму што не можа зразумець стары рэжысёр сучаснага драматурга.

Разлік драматургіі па працэнтах і лічбах — пытанне да вузкіх спецыялістаў. Напрыклад, да Міністэрства культуры. Гэта яны там усё ў працэнтах вызначаюць, і для іх гэтыя працэнты важныя. Ні гледачы, ні людзі творчыя гэтым не займаюцца. Яны проста твораць ці атрымліваюць асалоду. Тэатр — гэта не графікі і падлікі, а проста дыванок і артыст. І ўсё, больш нічога не трэба. Калі, зразумела, гэтаму артысту ёсць, што сказаць. А калі няма, тады і тэатра няма..."

Вольга ПРУДНІКАВА.

ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД

Андрэй КУРЭЙЧЫК, драматург:

— Я толькі што вярнуўся з Вялікабрытаніі, дзе размаўляў са спецыялістамі якраз пра гэта, — гаворыць малады драматург. — Мне расказалі, што нармальныя суадносіны пастановак у любой еўрапейскай краіне складаюць прыкладна 80 працэнтаў нацыянальнай драматургіі, 20 працэнтаў — на ўсё астатняе. А для Беларусі, я лічу, гэты працэнт павінен быць нават большым. Таму што нашы тэатры ўтрымліваюцца за кошт падаткаплацельшчыкаў. І абсалютнае дзікунства, калі гэтыя грошы ідуць не на нацыянальнае тэатральнае мастацтва, а на расійскія, еўрапейскія, кітайскія п'есы. Калі ў нас ставіцца, напрыклад, італьянская п'еса, тады трэба запрашаць італьянскіх рэжысёраў і акцёраў, якія будуць працаваць над ёй і якія будуць атрымліваць грошы замест нашых рэжысёраў і акцёраў, якія рабілі б яе адаптацыю. А калі супрацоўнікі нашых тэатраў атрымліваюць зарплату (чаго, трэба сказаць, драматургі не маюць), то пытанаць яны павінны з беларускіх п'ес. А колькасць беларускіх спектакляў у канкрэтныя месяцы — пры тым, што яны могуць ставіць два спектаклі па пяць разоў, пры тым, што яны падводзяць пад беларускую драматургію аўтарызаваны пераклад замежных п'ес, — ні аб чым не гаворыць.

У Вялікабрытаніі з яе шанаванымі традыцыямі і старадаўняй культурай тэатры самі разумеюць сваю адказнасць і перад гледачом, і перад нацыянальнай драматургіяй, а нашы тэатры на іх фоне выглядаюць не вельмі свядомымі. Для мяне дзікасць, калі ў тэатры беларускай драматургіі ставяць Чэхава! Мала таго, што ў падтэксце спектакль атрымліваецца сярэдні, так гэта яшчэ і ўдар па беларускай драматургіі! Бо гэты Чэхаў забівае як мінімум двух драматургаў, якія не нарадзіліся. А якія нарадзіліся, не атрымліваюць грошы і сыходзяць у іншыя прафесіі.

Як ні дзіўна, у тым жа Купалаўскім тэатры самыя касавыя спектаклі за ўсю гісторыю зроблены менавіта на творах беларускіх аўтараў. Так было і будзе заўсёды. Але шматлікія загадчыкі літаратурнымі часткамі займаюцца тым, што перакладаюць замежныя п'есы, маюць з гэтага працэнты, і ім проста нявыгадна ставіць беларускую драматургію ў рэпертуар. А між тым беларуская дзяржава, а значыць, увесь народ, плаціць грошы за то, каб яны чыталі, шукалі беларускія п'есы і прапаноўвалі іх да пастаноўкі. Калі яны не жадаюць шукаць новых Купалаў і Дударавых, значыць, яны не тую прафесію сабе выбралі. Калі яны аддаюць перавагу чытанню замежных п'ес, то хай сядзяць дома і там іх чытаюць.

Сучасных п'ес зараз шмат. Вядома, ёсць сярод іх і дрэнныя, але добрыя заўсёды можна знайсці. У крайнім выпадку можна замовіць п'есу, што з'яўляецца зноў жа нармалёвай практыкай ва ўсіх цывілізаваных краінах.

У мяне 24 п'есы, 40 пастановак у Казахстане, Маскве, Пецярбургу, Баку, Кіеве. Выдатнага драматурга Пашу Пражко паставілі ў Маскве, а тут — не. І такіх прыкладаў шмат. Хтосьці з маладых драматургаў кідае сваю прафесію, хтосьці сыходзіць у апазіцыю, хтосьці, як я, супрацоўнічае з іншымі краінамі. Я лічу, што гэта лепш, чым падаць у ногі розным загадчыкам і ўмаляць іх узяць п'есу...

ЗДАРЭННЕ

Скралі... аэрастат

Невядомыя зламыснікі скралі аэрастат, што быў прывязаны на даху выставачнага комплексу ў Мінску. Інцыдэнт адбыўся ноччу ў футбольным манежы, які часова быў пераабсталяваны ў выставачную пляцоўку на час правядзення 14-й Міжнароднай спецыялізаванай выставы "tibo".

У "tibo'2007" удзельнічаюць больш за 120 экспанентаў з Беларусі, Германіі, Расіі, Швейцарыі, Швецыі і іншых краін, вядучыя сусветныя вытворцы тэлекамунікацыйнага абсталявання і вядомыя кампаніі, прадстаўленыя на IT-рынку краіны. У іх ліку — адзін з лідэраў беларускага інтэрнэт-рынку ТАА "Адкрыты кантакт". Менавіта гэта кампанія і запусціла ў неба над манежам шасціметровы рэкламны аэрастат.

Паводле слоў дырэктара кампаніі Андрэя Іванова, паветраны шар быў прывязаны да самага даху выставачнага павільёна і лунаў на вышыні каля 30 метраў. *"Пад лёгкім павевам ветру ён то кружыўся, то накіроўваў свой нос у неба, нібы імкнучыся вырвацца. Увесь першы дзень выставы ён забаўляў разявак сваімі піруэтамі, а ў ноч на сераду хтосьці зрэзаў яго. Так і палящеў у цемру,* — расказаў БелаПАН А.Іваноў. — *Шкада. Калі ўжо ляцець, дык лепш днём. Хоць бы дзеці парадаваліся свабоднаму палёту. Старту, так бы мовіць".*

Дарэчы, напярэдадні прадстаўнікі "Адкрытага кантакту" хацелі занесці аэрастат да ранку ў павільён, але арганізатары выставы сказалі, што будынак рэжымны, добра ахоўваецца і шар не прападзе. Аднак раніцай аказалася, што тры тросы, якія ўтрымлівалі аэрастат на прывязі, акуратна перарэзаны, а сам ён знік.

Начальнік аховы выставы параіў пацярпелым звярнуцца ў міліцыю, адзначыўшы, што аэрастат быў размешчаны "па вуснай дамоўленасці" і акт аб прынятым яго пад ахову адсутнічае. А прадстаўнікі адміністрацыі футбольнага манежа прапанавалі прагледзець запісы камер назірання па перыметры будынка, адразу папярэдзіўшы, што на даху манежа такіх камер няма.

"Мы наўрад ці будзем займацца пошукамі нашага "дырыжабля", бо пасля выставы ён нам ужо не будзе патрэбны, — рэзюмаваў А.Іваноў. — *Добра было б, калі б хто-небудзь паведаміў або напісаў нам аб тым, каму мог спатрэбіцца аэрастат і куды ён змог даляцець".*

Як паведамілі БелаПАН у камандаванні ВПС і войскаў СПА Беларусі, ваенныя не маюць ніякай інфармацыі пра лёс паветранага шара.

Юрый ДАВІДОЎСКІ.

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ

За людей в масках извинились

Наша газета рассказывала об инциденте, который в начале апреля случился на ОАО "Полоцк-Стекловолокно", когда люди в масках захватили в заложники несколько человек, оказавшихся на проходной предприятия. Как сейчас стало известно, заместитель начальника ГУВД Минского горисполкома **Александр КОРЧЕВСКИЙ** извинился перед пострадавшими.

Приезд Корчевского на предприятие стал для всех неожиданностью. Всех работников, которые писали заявления с жалобами на грубые действия работников милиции, срочно обзвонили и пригласили на встречу с милицейским чиновником. Пришли восемь из 12 человек. Из руководства предприятия никого не было.

Корчевский извинился перед всеми за грубые действия милиционеров:

— Мы уже проводим разбирательство по этому случаю. Сотрудники ОБЭП выполняли задачу по изъятию документации на СП "AGV-Полспо" в связи с возбужденным уголовным делом. Недавно был случай, когда в наших сотрудников стреляли. Поэтому в этот раз для безопасности людей их сопровождала спецгруппа. Они-то и вели себя, по нашим сведениям, грубо по отношению к вам. Я приношу вам свои извинения и могу твердо пообещать, что такого больше не случится ни на одном из белорусских предприятий. Виновные обязательно будут наказаны.

Работники приняли к сведению принесенные извинения.

Алексей ИВАНОВ.

РЭГІЁН

Вёскі на каранціне

На тэрыторыю Гоцкага лясніцтва, вёскі Мазалі і Плянта, што ў Салігорскім раёне, накладзены каранцін.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, віной усяму — лісы, што былі забіты на згаданай тэрыторыі: у гэтай дзікай жывёлы пацвердзіўся дыягназ "шаленства". А таму Салігорскім райвыканкамам і было прынята адпаведнае рашэнне. Зацвярджаны таксама і план мерапрыемстваў па ліквідацыі шаленства. Зараз праводзяцца мерапрыемствы па дадатковай прышчэпцы хатняй жывёлы ў зоне каранціну. На шчасце, сярод жыхароў вёсак не выяўлена пацярпелых ад кантактаў з шалёнымі жывёламі. Каранцін працягнецца да 20 чэрвеня.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

У Нью-Йорку Зянон Пазьняк прэзентаваў свае кнігі

У Нью-Йорку адбылася прэзентацыя кніг Зянона Пазьняка, выдадзеных у эміграцыі. У 2000—2007 гадах выйшла сем кніг, але зараз увага была засяроджана ў асноўным на зборніках паэзіі і фатаграфій. Такіх выданняў тры — "Глёрыя Патрыя", "Вялікае Княства" і "Дарога".



Ужо некалькі апошніх гадоў пасля службы ў Саборы Св. Кірылы Тураўскага Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, на якую прыходзіць усё больш моладзі з новай эміграцыі, у грамадскай зале ладзяцца мерапрыемствы — сустрэчы з гасцямі з Беларусі, выставы, сяброўскія гутаркі. Так было і ў мінулую нядзелю. Спачатку парафіяне ўдзельнічалі ў набажэнстве, а потым пачалася прэзентацыя кніг Зянона Пазьняка, на якую сабралася каля сотні чалавек.

"Мяне вельмі ўзрушыла, што прыйшло шмат моладзі і што, калі чыталі вершы, на вачах у людзей былі слёзы, — сказаў Зянон Пазьняк Радыё Свабода. — *Вершы гэтыя напісаны ў розныя гады, у мяне падрыхтаваны і старыя рукапісы, трыццацігадовай даўніны, але, каб іх выдаць, — патрэбны час і сродкі. Ні аднаго, ні другога не хапае. Дарэчы, гэтыя кнігі выдадзены цалкам на грошы беларусаў, пры падтрымцы беларускіх патрыётаў і на ўласныя сродкі. Займацца адначасна палітыкай і творчасцю цяжка, амаль немагчыма. Бо творчасць палітыка звычайна альбо аплёўваецца апанентамі, альбо замоўчваецца. Наконт гэтага я не маю ілюзій. Але не шкадую, што дваццаць гадоў таму фактычна кінуў творчасць і заняўся палітыкай, бо жыццё прысвяціў найвышэйшай справе — стварэнню новай дзяржавы. І гэтая дзяржава існуе. Хай сёння ў ёй дыктатура — заўтра будзе вольная Беларусь, галоўнае, каб Беларусь жыла".*

Дарэчы, прадмовы да дзвюх апошніх кніг Зянона Пазьняка — "Вялікае Княства" і "Дарогі" — напісалі Рыгор Барадулін і Алесь Разанаў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

ЧУЛІ?

Каляндар прышчэпак можа змяніцца

Міністэрства аховы здароўя Беларусі плануе пашырыць пералік планавых прышчэпак. Пра гэта паведаміў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Міхаіл Рымжа.

Паводле яго слоў, медыкі абмяркоўваюць магчымасць увядзення прышчэпкі супраць хіб-інфекцыі — узбуджальніка, які можа выклікаць менінгіты і складаныя атыты ў дзяцей, а таксама супраць менінгакокавай інфекцыі. У прыватнасці, ужо сёлета са сталічнага бюджэту будуць выдзелены сродкі на вакцынацыю супраць хіб-інфекцыі дзяцей першых пяці гадоў жыцця гэтак званых груп рызыкі — тых, якія жывуць у дамах дзіцяці, у малазабяспечаных сем'ях, часта і працягла хварэюць.

Пры гэтым спецыяліст падкрэсліў, што календары прышчэпак у Беларусі і сумежных краінах — Расіі, Украіны, дзяржавах Балтыі — супадаюць, таму не могуць быць рэзка зменены.

Як паведаміў Міхаіл Рымжа, планавая вакцынацыя ў Беларусі праводзіцца цяпер супраць дзевяці інфекцый. Паводле яго слоў, толькі на першым годзе жыцця дзіця атрымлівае прыблізна 10 розных вакцын, таму медыкі "вельмі асцярожна падыходзяць да ўвядзення новых прышчэпак", каб пазбегнуць дадатковай нагрузкі на арганізм. Ён зазначыў, што "няма абсалютна бяспечных вакцын", таму прышчэпка заўсёды робіцца пасля медагляду і пад кантролем урача. Паводле слоў М.Рымжы, дзякуючы планавай вакцынацыі ў Беларусі многія інфекцыйныя захворванні сталі адзінкавымі або зніклі наогул. Так, у 2006 годзе было зарэгістравана 76 выпадкаў коклюшу (80 — у 2005 годзе), 395 — гепатыту А (676), не было выпадкаў слупняку. Апрача таго, Беларусь прызнаная краінай, у якой няма поліяміэліту.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ОТДЫХ

Белорусские санатории просят дотаций

О трудностях выживания за рубежом рассказывают руководители санатория «Белоруссия» в Мисхоре Николай Ментуз и Оксана Куденко

Белорусских здравниц за пределами Беларуси осталось не так много и все они борются за "свое место под солнцем". Вдали от родины счет в этой борьбе пока не в их пользу.

Например, из-за нехватки финансирования в прошлом году в санатории "Белоруссия" в Мисхоре (Крым, Украина) пришлось сократить фонд заработной платы. В первую очередь от такого нововведения пострадали медики, штат их был сокращен. Сегодня в этой здравнице штатный оклад имеют только несколько терапевтов, остальные врачи работают на договорной основе и ведут прием лишь несколько часов в неделю.

— Нет денег и на развитие медицинской базы, — не без горечи замечает заместитель главврача санатория **Оксана Куденко.** — В санатории нет аппарата УЗИ, другой аппаратуры, позволяющей пациентам пройти у нас полное обследование. Не хватает специалистов по узким направлениям.

Поскольку в санатории в основном отдыхают дети с родителями из чернобыльских районов, то педиатров сокращение не коснулось. Дети, к счастью, получают полный комплект медицинских услуг. А вот взрослые имеют минимальный медицинский пакет, который входит в оплату путевки. За остальные услуги приходится платить дополнительно, мы ведь хозрасчетное учреждение. Но это понимают далеко не все отдыхающие. Многие жалуются, пишут письма во всевозможные инстанции.



— А сколько стоит путевка в ваш санаторий?

— Надо признаться, немало. Например, слетать на отдых в Турцию, которая находится на противоположной стороне Крымского побережья, иногда обходится дешевле. К тому же в стоимость нашей путевки не входит проезд до здравницы, и для многих отдых в белорусском санатории становится неподъемным.

Отсюда и основная проблема — недогрузка санатория. Даже в пик сезона — в июне-августе он заполнен на 90%, а в межсезонье здесь вообще тихо.

— Самое уязвимое место нашей работы — продажа путевок, — дополняет коллегу главный врач санатория **Николай Ментуз.** — 60% из них реализует ГУ "ЦентрКурорт" Управления делами президента Беларуси, а остальные мы пытаемся распространять сами по коммерческим ценам. В этом пока у нас мало опыта. Заключили с 60 белорусскими туристическими организациями договоры, а реально работают с нами только пять. Создали внештатный отдел по продвижению туристического продукта, но пока в нем трудится только один сотрудник. Отдел, конечно, надо расширять и выезжать на туристические ярмарки в Россию и Украину. Белорусы к нам по коммерческим путевкам едут неохотно.

Кстати, на недавно прошедшей в Минске выставке "Отдых-2007" санаторий "Белоруссия" представил свой рекламный стенд. Помимо рассказа об уникальных климатических условиях Мисхора на стенде была и подробная информация об условиях проживания в санатории. Например, один из корпусов "Белоруссии" построен в 1916 году в архитектурных традициях итальянского Ренессанса. Только на территории белорусского санатория есть уникальная, единственная на всем побережье аллея с реликтовыми "мамонтовыми" дубами, а также тисом, магнолией и прочими экзотическими растениями, которых около 250. Недавно начал принимать отдыхающих и новый корпус, открытый солнцу, морским бризам, с современным гостиничным сервисом и номерами-люкс. Его, по слухам, помогал строить Мингорисполком, но на свой баланс столичные власти его так и не взяли. Возможно, побоялись посягнуть на президентскую собственность, санаторий "Белоруссия" принадлежит Управлению делами президента Беларуси.

— Мы не жалуемся на своих хозяев, — говорит Николай Ментуз. — Управделами президента проводит частичную реконструкцию санатория...

Но на побережье Крыма земля под новое строительство буквально на вес золота. Вокруг нашего санатория как грибы после дождя, растут 4—5-звездочные отели со СПА-услугами и иным сервисом. Нашей здравнице конкурировать с ними тяжело. А инвесторы по части услуг, в том числе и белорусские, обходят здравницу стороной. То же Министерство спорта и туризма Беларуси могло бы использовать наш санаторий в качестве одной из баз в межсезонье для своих тренировок по некоторым видам спорта. Могли бы проводить здесь круглогодично семинары, симпозиумы, конференции и другие министерства и ведомства. Условия для этого есть, но у белорусских чиновников нет желания.

— Для своих клиентов мы можем быть привлекательны только предлагаемыми медицинскими услугами, — говорит Оксана Куденко. — И мы можем похвастаться — наши наработки в медицине уникальны, за что в прошлом году Крымский европейский университет наградил наш коллектив дипломом первой степени. За эту награду боролись сто крымских здравниц. Кстати, мы имеем высшую аттестационную категорию в Украине и первую, самую высокую, в Беларуси.

В последнее время в санаторий стало меньше приезжать детей из чернобыльских районов Беларуси. Оксана Куденко объясняет это тем, что уменьшилось число льготников по заболеваниям, связанных с Чернобылем. Раньше на оздоровление в санаторий приезжали мамы с тремя детьми, а сейчас в основном — с одним ребенком: всей семье оздоровление обходится дорого.

Осенью прошлого года на очередном заседании Совета министров Беларуси было принято решение помочь четырем белорусским санаториям, расположенным за рубежом. В их число попало и ГМУ санаторий "Белоруссия" в Крыму. Правительство выделило 300 млн рублей, деньги пошли на оплату детских путевок. В течение четвертого квартала 2006 года мисхорский санаторий посетило 600 белорусских школьников. Было организовано четыре заезда по 150 человек, отдыхали школьники 21 день. Выиграл от этого и санаторий — получил дополнительные финансы. И что самое главное — оздоровились дети.

Но сколько белорусских ребят приедут в Мисхор в этом сезоне? Если здравница вынуждена будет самостоятельно искать деньги на выживание, то наверняка немного. Коммерческие путевки белорусам не по карману...

Галина ЕФИМОВА.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Парайцеся з гастраэнтэролагам...

Лічыцца, што самы просты спосаб схуднець — не есці пасля шасці гадзін вечара. Аднак у мяне праблемы са страўнікам, урач не раіць рабіць вялікія перапынкі ў ежы. Што рабіць?

Галіна, 37 год.

— Не есці пасля шасці гадзін вечара — гэта стандартная парада, якая падыходзіць далёка не ўсім, — кажа доктар медыцынскіх навук, неўролаг Таццяна Вазнясенская. — Хтосьці позна вяртаецца з працы, хтосьці з-за асаблівасцяў свайго арганізму не можа ёю скарыстацца. Таму ідэальны варыянт — гэта лёгкая вячэра. Сачыце за тым, каб апошні прыём ежы адбываўся не пазней чым за дзве гадзіны да сну. У такім выпадку лепей з'есці яблык ці нятлусты тварог. Добра піць на ноч кефір нізкай тлустасці, можна з кавалачкам чорнага хлеба. Калі кефір вам не даспадобы, выпіце шклянку ражанкі. Вельмі добра — рэдкі ягадны кісель альбо аўсяны адвар. Падыдзе і аўсяная каша, але не болей адной талеркі. Але перш чым прытрымлівацца гэтай парады, парайцеся з гастраэнтэролагам.

Алеся КОВАЧ.

ПРОБЛЕМА

Острая недостаточность

людей в белых халатах

Я человек уже не молодой и не очень здоровый. Часто приходится бывать и в поликлиниках, и в больницах. Всюду очереди, всюду жалуются на нехватку специалистов. Что это — кризис отрасли, люди не хотят работать врачами?

Роман Байдак, Минск.

Только в конце прошлого года власти признали, что в здравоохранении наблюдается не просто кадровый дефицит, а настоящий кадровый голод. По официальной информаци, в настоящее время проблема дефицита кадров существует и в крупных городах, и в сельской местности. Не хватает участковых терапевтов, педиатров, узких специалистов — хирургов, гинекологов, урологов, травматологов, психиатров, наркологов... Однако вице-премьер белорусского правительства на днях пообещал, что к 2013 году кадровая проблема в отрасли будет решена.

По мнению заместителя главы правительства, *"одной из причин кадрового дефицита в здравоохранении является сокращение набора в медицинские вузы республики в 1991—1995 годах — в некоторых высших учебных заведениях количество мест было урезано на 50% и более"*. Таким образом, сегодняшняя нехватка медицинских кадров — отголоски именно тех лет, подчеркнул Александр Косинец. *"После 1995 года стали постепенно увеличивать набор*, — уточнил он. — *В частности, в 2006 году — на 300 мест. Эта тенденция сохранится и в нынешнем году. Кроме того, дали возможность до 50% студентов принимать на внебюджетные места"*.

Александр Косинец обратил внимание на тот факт, что приблизительно 15—17% поступивших в медицинские вузы по разным причинам оставляют учебу.

"Есть и другая немаловажная деталь: в СССР регулировался прием в вузы "по половому признаку" — зачислялись 50% юношей и 50% девушек, — напомнил Александр Косинец. — *В настоящее время среди студентов медицинских вузов 80% составляют девушки. И естественно, что они со временем уходят в декретный отпуск, осуществляют уход за детьми"*.

Кстати, отвечая на вопрос о возможном запрете врачам государственных учреждений здравоохранения совмещать работу с работой в медицинских учреждениях негосударственной формы собственности, Александр Косинец заверил, что такая мера не рассматривается: *"После выполнения своей основной работы в государственной структуре врач, безусловно, может работать в частной фирме. Это его право. Запретов никаких не планируется вводить"*.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

Ежевика спасет от рака?

Вещество, в больших количествах содержащееся в лесных ягодах, овощах, фруктах и красном вине, может уничтожать раковые клетки, не нанося ущерба здоровым клеткам крови. По мнению ученых из Медицинской школы Питтсбургского университета, это химическое соединение может лечь в основу новых, менее токсичных препаратов для лечения некоторых форм лейкоза и лимфомы, сообщают мировые информагентства.

В исследовании ученые использовали одну из наиболее распространенных разновидностей антиоксидантов антоцианидинов — цианидин-3-рутинозид (C-3-R), полученный из ежевики. Они выяснили, что воздействие небольших концентраций C-3-R в течение 18 часов приводило к гибели 50% колонии клеток миелоидного лейкоза. Увеличение концентраций антиоксиданта вызывало гибель всех злокачественных клеток. Клеточные линии других разновидностей лейкоза и лимфомы реагировали на C-3-R сходным образом.

Изучая механизм воздействия C-3-R на злокачественные клетки, исследователи установили, что оно приводит к аккумуляции в митохондриях клеток активных соединений кислорода, что в свою очередь запускало процесс запрограммированной гибели клеток — апоптоза. В то же время воздействие C-3-R на нормальные клетки крови не приводило к подобному эффекту: напротив, как и другие антиоксиданты, C-3-R защищал клетки от негативного воздействия свободных радикалов.

По словам исследователей, наличие C-3-R в продуктах естественного происхождения дает основания рассчитывать на то, что это вещество не опасно для человека даже в больших концентрациях. Таким образом, оно представляет несомненный интерес как возможная основа для новых, менее токсичных по сравнению с современными средствами химиотерапии рака, лекарств.

Забруджаныя радыяцыяй прадукты харчавання возяць у Мінск

На Радыё Свабода адбылася онлайн-канферэнцыя з членам-карэспандэнтам Акадэміі навук Беларусі Іванам Нікітчанкам, прысвечаная 21-й гадавіне чарнобыльскай трагедыі. Слухачы тэлефанавалі ў студыю і дасылалі свае пытанні на сайт Радыё. Многія з іх тычыліся ўздзеяння радыяцыі на здароўе людзей. Некаторыя адказы вучонага друкуе і наша газета.

— Сёння радыяцыяй забруджана амаль уся тэрыторыя Беларусі — дзе болей, дзе меней. Больш там, дзе яна была і спачатку, — поўдзень Гомельшчыны і Брэстчыны, паўночны ўсход Магілёўскай вобласці. Плошча, забруджаная радыенуклідамі, з моманту апошняга маніторынгу тэрыторыі ў 1987 годзе павялічылася — па афіцыйным уліку, на 42 тысячы гектараў. Акрамя таго, стронцыем забруджана каля 500.000 га.

Па афіцыйных даных, у Мінскім раёне няма забруджаных земляў. Але гэта можа быць і не так. Таму што ў свой час у 1987 годзе быў сакрэтны загад па Дзяржаграпраму БССР, па якім развезена было па ўсіх камбікормавых заводах Беларусі мільён тон радыеактыўнага зерня, 1.660.000 тон радыеактыўнага абястлушчанага малака, 200.000 тон травяной мукі, 52.000 тон радыеактыўных касцей у выглядзе мяса-касцявой мукі. Гэта скармлівалася на птушкафабрыках і свінаводчых комплексах. А потым вырабляўся кампост, які ўносілі на палі ў якасці ўгнаенняў. Таму я лічу, што амаль уся тэрыторыя Беларусі забруджана, але шмат дзе яе ніхто не правяраў. І зараз ніхто не хоча гэтага рабіць. Таму я і прапаную правесці пагалоўнае абследаванне людзей на радыеактыўнасць цела.

— Да ідэі будаўніцтва АЭС у Беларусі я стаўлюся вельмі адмоўна. Бо тыя 20 працэнтаў, што збіраюцца атрымаць праз яе будаўніцтва, можна атрымаць іншым шляхам. Найперш праз мадэрнізацыю тэхналогій. У адным толькі аграрным сектары мы можам значна больш сэканоміць энергіі, чым дасць АЭС. І такая мадэрнізацыя вывела б нашу сельскую гаспадарку на патрэбны ўзровень і зрабіла б яе канкурэнтаздольнай.

— Як навуковец, я ведаю, што амерыцый, кадмій, плутоній, увайшоўшы ў метабалічны цыкл арганізма, ужо не пакідаюць арганізм, больш за тое, істотна ўплываюць на змяншэнне трываласці арганізма і нават змяняюць эфект дзеяння лекаў. Ці ведаеце Вы нешта наконт Праграмы новых лекаў, якія ўлічваюць эндагенныя радыенукліды? (Валер ГРЫЦУК.)

— Такіх лекаў пакуль што няма. А што ўводзяць зараз у прадукты — ніхто не ведае, бо сістэма кантролю, якая была ўтворана ў 1980-я гады, уся разбураная.

Мы маем даныя, што такія рэчы ў харчовых прадуктах, у прыватнасці ў мясе, ёсць.

— Мы распрацавалі прэпараты, якія блакіруюць радыенукліды ў арганізме. У 2002 годзе гэты праект быў ухвалены Акадэміяй навук і накіраваны ў Дзяржкамчарнобыль. Але адтуль ужо пяты год адказу ніякага няма...

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

Камни растут, не предупреждая

На вопросы отвечает уролог, профессор минского МГМУ Александр СТРОЦКИЙ

— Если удалить камни из почек оперативным путем, есть ли гарантия, что они не появятся вновь?

— Нет. В организме действует механизм, который приводит к камнеобразованию. Мы удаляем камень, а процесс, который привел к камнеобразованию, зачастую остается. Конечно, не во всех случаях после операции по удалению камней они появляются вновь. Тем не менее риск остается. Поэтому грамотный уролог никогда вам не скажет, что, удалив камень, вы навсегда забудете о мочекаменной болезни.

— Есть ли в анализе мочи показатели, которые указывают на процесс образования камней?

— Как бы было хорошо, если бы такой анализ был настолько информативным! К сожалению, это невозможно.

— Значит, заранее вообще никак об этом не узнаешь? Как же тогда обезопасить себя от появления камней в почках?

— Прежде всего необходимо следить за тем, чтобы количество мочи за сутки было не менее 1200 мл. У людей, страдающих мочекаменной болезнью, объем мочи за сутки меньше 1 литра. Для почек неприемлемо однообразное питание, особенно богатое кальцием. Необходимо также следить за здоровьем в целом: вовремя диагностировать заболевания, связанные с нарушением обмена веществ, которые повышают риск камнеобразования, например, подагру, гиперфункцию паращитовидных желез, а также лечить инфекции мочевых путей.

ng.by

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 МАЯ 2007 г.

ЭКСПЕДИЦИЯ

Взойти на «Пуп Земли»

Белорусские альпинисты, участвующие в проекте "Семь вершин", намерены покорить вершину одного из самых высоких потухших вулканов планеты — Коропуна (6 тыс. 425 м) на территории Перу.

Как рассказал перед отъездом руководитель проекта Сергей Варивода, прежде всего группа должна будет взойти на "Пуп Земли" — именно так переводится с языка индейцев кечуа название города Куско в Перу, некогда столицы огромной империи инков. Эта местность находится на высоте 3 тыс. 360 м над уровнем моря. Затем белорусы отправятся в четырехдневный акклиматизационный горный трекинг к последнему пристанищу инков — затерянному городу Мачу-Пикчу. *"Наш маршрут — это тот путь, которым инки отступали в горы под натиском испанских конкистадоров в 1533 году"*, — отметил Сергей Варивода. Ежедневно альпинисты планируют проходить по 15—20 км на высотах до 4 тыс. 200 м.

По словам руководителя проекта, все пять месяцев, которые ушли на подготовку группы к восхождению, белорусские альпинисты отрабатывали технику преодоления снежно-ледовых склонов. Тренировки проводились на ледниках в Альпах. Сергей Варивода оценивает технический уровень подготовки участников как достаточный. Успех экспедиции во многом будет зависеть от погоды, которая особенно непредсказуема в этом регионе планеты. Сейчас, например, идут сильные дожди. Восхождение планируется начать в ночь с 4 на 5 мая.

Отметим, что это третья экспедиция альпинистов проекта "Семь вершин" в южноамериканские Анды. В 2004 году успешно покорена самая высокая вершина континента Аконкагуа (6962 м) в Аргентине, а в 2005-м — самый высокий в мире действующий вулкан Котопакси (5897 м) в Эквадоре.

Соб.инф.

ДИКАЯ ИСТОРИЯ

Собака покусала детей прямо на уроке физкультуры

Урок физкультуры для второклассников СШ №23 Гродно превратился в кошмар. Утром учителя 2 "Б" и 2 "Д" классов вывели детей в коридор, чтобы отвести в спортивный зал, когда в школу вбежала собака предположительно бойцовской породы.

Дети испугались, начали кричать и бежать, что заставило пса броситься в атаку. Из пяти школьников больше всех пострадал мальчик, которому собака захватила руку. Чтобы разжать "мертвую" хватку, учителя завели мальчика в класс, а собаку в коридоре пытались прищемить дверью. Остальные четверо детей, испытав шок, отделались царапинами. Спасли школьников учителя физкультуры и информатики, которые загнали опасного гостя в раздевалку до приезда работников спецавтохозяйства. По словам заведующего травматологическим пунктом УЗ "Гродненская больница скорой медицинской помощи" Виктора Жегздрина, всем пострадавшим была оказана помощь. Теперь школьникам делают прививки и дают необходимые препараты. Собака изолирована, через десять дней станет ясно, больна ли она бешенством. Если диагноз не подтвердится, прививки делать перестанут. Пес считается бродячим, поскольку хозяин собаки, у которой, по некоторым данным, был ошейник, так и не объявился, сообщает "Вечерний Гродно".

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй МЕЗІН:

«Ніколі нельга апускаць планку»

У двух матчах групавога турніру на чэмпіянаце свету па хакеі ў Расіі зборная Беларусі пацярпела адчувальныя паражэнні ад чэхаў — 8:2 і амерыканцаў — 5:1. Аб прычынах такога няўдалага старту разважае галкіпер нашай зборнай Андрэй Мезін.

— Ці былі пасля гэтых матчаў размовы галоўнага трэнера з камандай? Ці спрабаваў ён правесці работу над памылкамі?

— З кожным Курт Фрэйзер размаўляў індывідуальна. Са мной таксама была размова. Нармальна пагутарылі хвілін пяць. Я не хачу выносіць смецце з хаты. Але нічога дрэннага ён не казаў, наадварот, казаў толькі добрае, аддзячыў. Абмеркавалі, што было не так. Да таго ж у гульні з амерыканцамі я сябе дрэнна адчуваў. Гуляў прастуджаны.

— Як жа Вы гулялі ў такім стане?

— На самай справе вельмі цяжка было. Я ледзь не заснуў на гульні (смяецца. — Рэд.). Да арэны доўга дабіраліся, за тры гадзіны, потым у палацы сядзелі. Дзесьці кавы перапіў, таблетак пераеў. Канечне, ніхто сябе не апраўдвае, але так гуляць нельга.

— Адчувалася нейкая разгубленасць з боку беларускай каманды...

— Напэўна, расслабіліся.. Усё ж такі выйгралі шэсць таварыскіх сустрэч запар. Здавалася, была ўпэўненасць. Але з такімі камандамі, як зборная ЗША, трэба гуляць яшчэ лепш.

— Ці ёсць магчымасць у зборнай Беларусі гуляць лепш?

— Наша каманда знаходзіцца на стадыі аднаўлення, і нам патрэбна атрымліваць вопыт у такіх гульнях. Узроставыя хакеісты сышлі, і трэба, каб моладзь разумела, куды трапіла. Мы не гаворым зараз аб нейкіх медалях, хаця ўвогуле прыходзілася гаварыць, каб верыць і народ верыў.

— Ці не паспяшаліся ставіць высокія задачы, аб якіх ішла гаворка перад турнірам?

— Ніколі нельга апускаць планку. У мінулым годзе занялі шостае месца. І таму трэба імкнуцца да лепшага. Калі ёсць задача проста застацца ў эліце, тады можна прапускаць па 20 шайб і спакойна выходзіць потым, не хвалюючыся. Задачы заўжды трэба рашаць высокія.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.
Фота photo.bymedia.net

P.S

Перад падпісаннем нумара ў друк зборная Беларусі завяршыла свой трэці матч на чэмпіянаце свету — супраць аўстрыйцаў. Лік сустрэчы 5:2 на карысць беларусаў.

Такім чынам, наша зборная выйшла з групы. На наступным этапе яе саперникамі будуць каманды Канады, Славакіі, Германіі ці Нарвегіі.

Лимит на иностранцев

Лимит на легионеров в национальном чемпионате Беларуси в ближайшие три года будет ужесточаться. Об этом было заявлено на заседании исполкома Федерации хоккея Республики Беларусь.

В ближайшем сезоне в заявочном списке на игру в составе одной команды должно быть не более пяти иностранных хоккеистов. Причем налог на каждого легионера составляет 2 тысячи долларов, а на иностранного вратаря — и вовсе десять тысяч.

Через год, в чемпионате-2008/09, лимит на легионеров будет сокращен до четырех человек, а налог на полевого иностранного хоккеиста увеличен до трех тысяч. В первенстве Беларуси-2009/10 планируется ввести полный запрет на голкиперов-легионеров, а допустимое число зарубежных полевых игроков уменьшить до трех. Причем за каждого из них придется заплатить уже по четыре тысячи долларов.

Эти меры призваны помочь раскрыться молодым белорусским игрокам, которым порой сложно попасть в состав из-за большого количества легионеров. При этом остается в силе положение, согласно которому иностранный хоккеист, беспрерывно отыгравший в белорусском клубе не менее четырех лет, легионером не считается. Не будут являться легионерами и молодые зарубежные игроки, родившиеся в 1988 году и позже.

Налоги же, взимаемые за иностранцев, ФХРБ планирует потратить на уплату аналогичных сборов, установленных Федерацией хоккея России для клубов суперлиги, где выступают белорусские вратари. Предполагается, что благодаря компенсациям со стороны Беларуси российские дружины охотнее будут заключать контракты с нашими голкиперами, которые получат необходимую игровую практику на высоком уровне.

Кстати, на исполкоме ФХРБ были очерчены также контуры предстоящего сезона. Начнется он соревнованиями на Кубок Беларуси, розыгрыш которого пройдет с 3 по 25 августа. В отличие от прошлого года состоится лишь один финальный матч — на площадке победителя предварительного этапа.

Чемпионат Беларуси начнется 5 сентября, а завершится 10—12 апреля. Киевский "Сокол" подтвердил свое участие в турнире, поэтому наше национальное первенство уже в четвертый раз будет открытым. Всего в экстралиге выступят 11 команд, которые проведут на первом этапе шестикруговой турнир. А затем восьмерка лучших продолжит борьбу за медали по системе плей-офф.

В заявку на чемпионат Беларуси команда экстралиги может включить не более 30 хоккеистов. При этом будет три дозаявочных периода, когда можно вносить новые фамилии и вычеркнуть прежние. Однако общее количество игроков не должно превышать 30. На стадии 1/2 финала командам разрешено укрепляться легионерами, выступавшими в ходе сезона в чемпионатах других стран. Но этих хоккеистов необходимо заранее внести в заявочный лист на чемпионат и заключить с ними страховочные контракты. К тому же эти легионеры должны быть гражданами Беларуси, передает БЕЛТА.

ТРАГЕДЫЯ

Памёр падчас трэніроўкі

Трагедыяй завяршылася трэніроўка групы падрыхтоўкі футбалістаў 1993 года нараджэння, якая праходзіла на адным з палёў базы ФК "Мінск" на праспекце Пераможцаў (Машэрава).

Падчас заняткаў стала дрэнна гульцу Паўлу Скавышу, паведамляе газета "Прессбол". Яму аказвалі дапамогу дзве брыгады "хуткай дапамогі", якія прыбылі адна за адной, але безвынікова.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ЧУЛІ?

Алімпіяды будзе больш?

Цалкам верагодна, што Алімпійскія гульні-2008 года, якія пройдуць у Пекіне, будуць паказаны беларускім балельшчыкам у большым аб'ёме, чым планавалася раней. Пра гэта "Народнай волі" паведаміў прэс-аташэ Нацыянальнага алімпійскага камітэта Пётр Рабухін.

"Раней Міжнародны алімпійскі камітэт дазваляў паказваць алімпійскія гульні толькі той тэлекампаніі, якая афіцыйна выкупляла правы на трансляцыю гульняў. У нашай краіне такім манапалістам у добрым сэнсе гэтага слова была Белтэлерадыёкампанія, — гаворыць Пётр Паўлавіч. — *Распачынаючы з наступнай летняй Алімпіяды, сітуацыя мяняецца. Правы на трансляцыю гульняў пекінскай Алімпіяды, як звычайна, выкупіла Белдзяржтэлерадыёкампанія. Аднак Міжнародны алімпійскі камітэт правадзіць дадатковую акрэдытацыю для тэлеканалаў. Заяўку ў гэтую структуру падало Агульнанацыянальнае тэлебачанне (АНТ). У выпадку яе задавальнення АНТ таксама атрымае права трансляваць спаборніцтвы без усялякай дадатковай аплаты. Адказ з МАК прыйдзе ў самы бліжэйшы час. Так што не выключана, што беларускія спартыўныя балельшчыкі змогуць убачыць Алімпійскія гульні ў большым аб'ёме. Адзначу, што ўсе фінансавыя выдаткі, звязаныя з арганізацыяй трансляцый, і БТ і АНТ бяруць на сябе",* — адзначыў прэс-аташэ НАК.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Пакуль улады не знялі блакаду, зрабіце, калі ласка, перадаплату за будучыя нумары «Народнай волі»

Шаноўныя чытачы!

На жаль, і сённяшні нумар газеты мы вымушаны былі друкаваць у Смаленску, распаўсюджваем, як і раней, уласнымі сіламі.

Спадзяёмся, што перамовы з уладамі дадуць плённы вынік. Але пакуль давайце дзейнічаць так: хто не зрабіў **перадаплату** за майскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у красавіку атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам давядзецца развітацца.

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: афармліць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, сусядзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не афармліць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім афармліць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць афармліць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				

Кассир

Плательщик

Пеня
Всего

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

Плательщик

Пеня
Всего

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский пункт обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ДАРЭЧЫ

Замежныя каманды, зацікаўленыя ў беларускіх хакеістах, павінны будуць выплаціць ад 6000 да 35.000 еўра ў залежнасці ад узросту гульца. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні выканкама Федэрацыі хакея Беларусі.

Вызначаны лепшыя гульцы чэмпіянату-2005/2006 па намінацыях: варатар — Леанід Фацікаў ("Дынама", Мінск), абаронца — Аляксандр Макрыцкі ("Дынама", Мінск), нападаючы — Алег Антоненка ("Дынама", Мінск), нападаючы абарончага плана — Андрэй Міхалёў ("Керамін", Мінск), малады гулец — Міхаіл Стэфановіч ("Гомель"), а таксама лепшая арэна — гомельскі Лядовы палац. Лепшым арбітрам прызнаны Сяргей Бярвенскі.

ЗНАЙ НАШИХ!

Романов — чемпион

Белорус Юрий Романов защитил титул чемпиона Европы по боксу среди профессионалов в весовой категории до 61,235 кг. В минском Дворце спорта наш соотечественник уже в третьем раунде нокаутировал своего соперника болгарина Тончо Тончева и оставил чемпионский пояс у себя.

Столь скорое окончание поединка вовсе не означает, что болгарский боксер оказался слабым оппонентом. 34-летний Тончо Тончев становился серебряным призером Олимпиады-96 в Атланте, а после перехода в профессионалы завоевывал титулы интерконтинентального чемпиона по версиям WBC и WBA, носил звание чемпиона Европы-2001. За долгую карьеру на профессиональном ринге он провел 41 бой и одержал 37 побед, причем 21 — нокаутом. Недавно опытный спортсмен сменил тренера и под руководством Николя Рифара переживает вторую молодость.

Как сказал после боя счастливый победитель, он настраивался на долгое 12-раундовое противостояние с опытным и техничным соперником. На вопрос, рассчитывал ли спортсмен на столь скорую развязку, триумфатор ответил: *"Я не рассчитывал, а старался. Не следует планировать окончание боя к какому-то определенному моменту, нужно быть готовым к длительному изнурительному поединку. Мысли же о досрочном его окончании могут сослужить плохую службу".*

Соб.инф.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 2.05.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №